Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

4 ЛЮТАГА 2023 г. СУБОТА № 23 (29903)

ХТО РАСПАЎСЮДЗІЎ ТЫТУНЬ ПА ЎСІМ СВЕЦЕ? 7

ЛЕАНІД ШЧАМЯЛЁЎ – ПРЫКЛАД У ЖЫЦЦІ І МАСТАЦТВЕ 12

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксей БАГДАНАЎ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю:

«Карэкціроўка пастановы № 713 «Аб сістэме рэгулявання цэн» не змяняе сутнасці дакумента. Цэнавае рэгуляванне застаецца і нават у некаторых таварных групах пашыраецца. На працягу чатырох месяцаў дзеяння гэтай пастановы ўжо ёсць станоўчыя вынікі. Па выніках года ўдалося запаволіць інфляцыю да 12,8 %. Дакумент «жывы», і яго неабходна карэкціраваць у залежнасці ад эканамічнай сітуацыі ў краіне або за мяжой. Сутнасць змен у тым, што мы аптымізуем частку адміністрацыйных працэдур, удакладняем некаторыя фармулёўкі, а таксама ўдасканальваем падыходы па аднясенні расходаў, якія нясуць таваравытворцы або імпарцёры, на той ці іншы артыкул затрат. Асноўныя змяненні датычацца карэкціроўкі прыняцця рашэнняў дзяржорганамі аб змяненні цаны. Дэталізуецца інфармацыя, якая будзе ўказвацца ў таварна-транспартных і таварных накладных. Гэта дазволіць суб'ектам гаспадарання больш дакладна разумець, як фарміраваць канчатковую цану для спажыўцоў».

КАРАТКА

- Першы энергаблок БелАЭС выпрацаваў 11,7 млрд кВт•гадзін электраэнергіі.
- **БЧ прызначыла дадатковыя цягнікі ў зносінах з Расіяй.**
- Працэс перарэгістрацыі палітычных партый пачнецца найбліжэйшым часам.

ISSN 1990 — 763X

ЧЫСТАЯ РАБОТА

У Сяргея ЛАБАЦЭВІЧА, які працуе ў філіяле «Мінсктранса» «Транспартны парк № 2», незвычайная спецыяльнасць, пра якую большасць пасажыраў нават не здагадваецца. Ён вадзіцель тралейбуса рамонтнай майстэрні, брыгадзір вадзіцеляў тралейбусаў, занятых выкананнем манеўровых работ. Кіроўцы транспарта, што працуюць на маршрутах, толькі прыганяюць машыну ў парк, а далей за работу бярэцца Сяргей і яго калегі. А работы, якая патрабуе адмысловага ўмення, хапае: зняць люстэркі, іх мацаванні прыціснуць да кузава, зачыніць усе люкі, дзверы, вокны. І нарэшце, ехаць на мыйку і там сачыць, каб шчоткі працавалі належным чынам, пры гэтым рухацца плаўна з хуткасцю не больш за тры кіламетры за гадзіну...

Віктар ІВАНЧЫКАЎ, фота аўтара.

Спажывец

ЯК КОТ НА САЛА

Маніторым галоўны зімовы прадукт

У нашых шыротах адвеку сала зімой — прадукт нумар адзін. Праўда, быў час, калі дыетолагі ставіліся да яго з нелюбоўю і неадабрэннем — гэта пачалося ў канцы мінулага стагоддзя, калі разгарнулася «вайна з халестэрынам». Але сёння сала цалкам рэабілітавана, а спецыялісты, якія вывучаюць здаровае харчаванне, выступаюць за адмову ад штучных, абястлушчаных прадуктаў на карысць здаровай натуральнай ежы.

Лірычнае адступленне

Наогул, сала можна з поўным правам назваць «суперфудам» нашага часу. Справа ў тым, што ў сувязі з надыходам загадзя прадказанай імунолагамі эпохі вірусных захворванняў, пачынаючы з 2019-га, толькі лянівы хоць бы раз (а часцей за ўсё — і неаднойчы) не пацікавіўся тым, што пішуць пра падтрыманне і ўмацаванне імунітэту. Асабліва гэтая цікавасць актуальная ў халодную пару года, калі незлічоныя вірусы (ад коўіду да грыпу і разнастайных ВРВІ) так і шукаюць, на каго б накінуцца. Адзін з найважнейшых фактараў паспяховага супрацьстаяння вірусным хваробам — правільнае харчаванне, і ў ліку першых сярод карысных для імунітэту прадуктаў медыкі называюць сала. Справа не ў яго каларыйнасці (зімой для «абагравання» арганізма каларыйнасць харчавання рэкамендуецца павялічыць на 10—15 %) і не ў яго лёгкай засваяльнасці (сала засвойваецца лепш і хутчэй за тлустае мяса або масла, таксама неабходныя ў халады). І нават не ва ўнікальным «кактэйлі» з вітамінаў і мікраэлементаў (прадукт змяшчае вітаміны A, E, F, D, C, групы B, а таксама фосфар, калій, натрый, магній і антыаксіданты, як паветра неабходныя людзям, што жывуць у экасістэме вялікага горада).

СТАР. 11

Актуальна

КІБЕРМАХЛЯРОЎ АДЛОЎЛІВАЮЦЬ ЦЭЛЫМІ «ПАЧКАМІ»

Колькасць пацярпелых ад дзеянняў міжнароднай злачыннай групы «інтэрнэт-кідалаў» ідзе на тысячы

Ужо не першы год нас просяць быць больш уважлівымі пры зносінах з незнаёмцамі ў інтэрнэце, але... Сёння любы чалавек, уладкоўваючыся на работу, адсылае сваю анкету па «электронцы», і работадавец вас вывучае не толькі па анкеце, але і па сацыяльных сетках, блогах, каналах і чатах, дзе можа знаходзіцца чалавек. Таксама змяняецца і злачыннасць. Ашуканцы, бачачы, што ўсё сышло ў сетку, таксама перакваліфікаваліся. Цяпер кіберзлодзеям не трэба ўзломваць дзверы ў кватэру і красці рэчы. Усё прасцей і адначасова складаней.

СТАР. 3

Гандлёва-эканамічнае і інвестыцыйнае ўзаемадзеянне

Прэзідэнты Беларусі і ААЭ дамовіліся аб супрацоўніцтве па больш як дзясятку напрамкаў

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка і Прэзідэнт ААЭ шэйх Мухамед Бен Заід аль-Нахаян падчас перагавораў у Абу-Дабі дамовіліся аб супрацоўніцтве па многіх напрамках.

Сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў доўжылася каля чатырох гадзін. Кіраўнік ААЭ запрасіў беларускага калегу дадому, сустрэча праходзіла ў абсалютна сяброўскай абстаноўцы. Спачатку ў пашыраным складзе, пасля — сам-насам.

Асабліва трэба адзначыць той факт, што ў сустрэчы прымалі ўдзел старэйшы і малодшы сыны Прэзідэнта Беларусі, гэта таксама сведчыць аб асаблівым характары адносін, па-сапраўднаму сяброўскім.

У цэлым у час сустрэчы беларускі і эмірацкі лідары дамовіліся аб супрацоўніцтве па больш як дзясятку напрамкаў: у сферы гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага ўзаемадзеяння. Акцэнт зроблены і на гуманітарнай сферы.

Згодна з дамоўленасцямі, у найбліжэйшы час у Беларусь прыбудзе вялікая дэлегацыя спецыялістаў, якія на месцы адпрацуюць канкрэтныя пытанні па абазначаных напрамках узаемадзеяння.

У тэму

Сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам ААЭ шэйхам Мухамедам Бен Заідам аль-Нахаянам была вельмі дружалюбнай і грунтоўнай. Аб гэтым заявіў журналістам Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах Андрэй Лучанок.

«Гаворачы аб сустрэчы кіраўнікоў дзвюх дзяржаў, мы можам адзначыць, што, па-першае, яна атрымалася вельмі цёплай і дружалюбнай, як і заўсёды. А па-другое, вельмі грунтоўнай. Былі абмеркаваны практычна ўсе напрамкі двухбаковага супрацоўніцтва — як традыцыйныя (гандаль, інвестыцыйныя праекты), так і перспектыўныя. Увогуле каля дзесяці. Таму рыхтуемся працаваць. Спадзяёмся, што гэта работа будзе выніковай», — расказаў Андрэй Лучанок.

Паводле БелТА.

Парламенцкі дзённік

Карэкціроўкі, запатрабаваныя часам

Пасяджэнне экспертнага савета пад кіраўніцтвам спікера верхняй палаты парламента Наталлі Качанавай прайшло ў Савеце Рэспублікі, паведамляе БелТА.

Фота БелТА.

Першае пытанне, вынесенае на абмеркаванне, — законапраект «Аб змяненні Бюджэтнага кодэкса Рэспублікі Беларусь». Праект закона падрыхтаваны ў мэтах прывядзення Бюджэтнага кодэкса ў адпаведнасць са змяненнямі і дапаўненнямі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, прынятымі на рэспубліканскім рэферэндуме 27 лютага 2022 года. Акрамя таго, уносяцца некаторыя кропкавыя карэкціроўкі для прывядзення асобных артыкулаў кодэкса ў адпаведнасць з дзеючым цяпер заканадаўствам, нацэленыя на забеспячэнне ўстойлівага і збалансаванага выканання бюджэту.

Па законапраекце на экспертным савеце зрабіў даклад міністр фінансаў Юрый Селівёрстаў, а таксама выказаліся ўдзельнікі пасяджэння. У прыватнасці, было падкрэслена, што ўсе прапанаваныя змяненні сістэмныя, паслядоўныя, накіраваны на стабілізацыю бюджэтных адносін. Сярод навацый — надзяленне кіраўніка дзяржавы дадатковымі паўнамоцтвамі па рэгуляванні бюджэтных адносін на працягу фінансавага года.

Разам з тым, як агучана на экспертным савеце, карэкціроўка Бюджэтнага кодэкса ўжо наспела, і больш комплексная. Таму ў далейшым пры яго карэкціроўцы будзе забяспечаны комплексны падыход, які ўлічвае ў тым ліку прапановы мясцовых органаў улады. Такая работа запланавана на 2024 год.

Яшчэ адно пытанне, разгледжанае на экспертным савеце, — праект закона «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных закупках тавараў (работ, паслуг)». Як было адзначана, карэкціроўка заканадаўства забяспечвае абарону нацыянальнага рынку.

Еўразійская інтэграцыя

ТРЫ ЧВЭРЦІ РАЗЛІКАЎ УЗАЕМНАГА ГАНДЛЮ Ў ЕАЭС — У НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ВАЛЮТАХ

Але на гэтым спыняцца не варта, лічыць беларускі прэм'ер-міністр

У ЕАЭС патрэбны дзейсныя інструменты стымулявання прамысловай каапэрацыі. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА ў час пасяджэння Еўразійскага міжурадавага савета ў Алматы.

Фота БелТА.

«Беларускі бок чакае, што рушыць наперад у пытаннях стварэння ў ЕАЭС новых высокатэхналагічных вытворчасцяў нам дасць магчымасць механізм фінансавага садзейнічання каапэрацыйным праектам, работа якога павінна быць запушчана ў самыя кароткія тэрміны пасля прыняцця адпаведнага рашэння кіраўнікамі дзяржаў. Нагадаю, што ўпершыню ў гісторыі нашага саюза прынята рашэнне накіроўваць на падтрымку прамкааперацыі бюджэтныя сродкі ЕАЭС. Зроблена гэта будзе шляхам кампенсацыі працэнтных ставак за выкарыстанне пазыковых сродкаў. Аднак аднаго механізма суфінансавання ставак недастаткова. Патрэбны і іншыя інструменты стымулявання прамысловай каапэрацыі», — сказаў Раман Галоўчанка.

Паводле яго слоў, для вырашэння гэтай задачы неабходна прыцягнуць нацыянальныя і еўразійскія інстытуты развіцця, увязаць іх дзейнасць з дасягненнем доўгатэрміновых стратэгічных мэт сацыяльна-эканамічнага развіцця ЕАЭС. Прэм'ер-міністр таксама падкрэсліў, што да запуску механізма фінансавай падтрымкі павінна быць гатова і прамысловасць. «Фарміраванне і адбор перспектыўных і актуальных праектаў, у якіх павінен быць забяспечаны ўдзел як мінімум трох дзяржаў-членаў, неабходна пачаць ужо цяпер. Хачу акцэнтаваць важную ролю камісіі, якая павінна выступіць сістэмным каардынатарам адпаведнай работы», — дадаў ён.

Раман Галоўчанка акцэнтаваў увагу на развіцці лагістычных сувязяў і інфраструктуры. «Мы знаходзімся ў працэсе перабудовы лагістычных калідораў. Без стабільнай лагістыкі, якая функцыянуе, адаптаванай да новых геапалітычных рэалій, перспектывы развіцця нашых эканомік не будуць радасныя. У сувязі з гэтым на знешнім контуры, у тым ліку ў рамках узаемадзеяння з ШАС і БРІКС, павінна весціся прадметная работа па стварэнні перспектыўных міжнародных транспартных калідораў, такіх як Поўнач — Поўдзень і Захад — Усход», — сказаў прэм'ер-міністр.

Ён адзначыў, што неабходна ў рамках кантэксту транспартнага калідора сур'ёзна працаваць з Іранам і Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі з улікам пераговараў аб стварэнні зоны свабоднага гандлю з гэтымі дзяржавамі, каб стварыць максімальна бясшвовы і камфортны маршрут транспарціроўкі да партоў Персідскага заліва.

«Трэба вырашаць задачы па фарміраванні патрэбнай інфраструктуры. Таму я прапанаваў бы нашым еўразійскім інстытутам развіцця весці прадметны дыялог з адпаведнымі структурамі, заснаванымі краінамі дружалюбных нам рэгіянальных аб'яднанняў. Напрыклад, вельмі актуальным можа стаць узаемадзеянне са створаным у рамках БРІКС Новым банкам развіцця», — звярнуў увагу Раман Галоўчанка.

Ён закрануў тэму забеспячэння ўзаемных разлікаў і інтэграцыі разлікова-плацежных сістэм на аснове выкарыстання нацыянальных валют. «Пасля доўгіх размоў і тэарэтычных спрэчак мы перайшлі да рэальных крокаў па дэдаларызацыі эканомік. Апераджальнымі тэмпамі ідзе працэс пазбаўлення ад замежных валют, якія скампраметавалі сябе ў знешнім гандлі. Тры чвэрці разлікаў у рамках узаемнага гандлю ў ЕАЭС ужо ажыццяўляецца ў нацыянальных валютах. Гэта добры вынік. Трэба ісці далей», — падкрэсліў ён.

Паводле яго слоў, санкцыйныя меры і тыя працэсы, якія запушчаны, будуць толькі паскараць глабальную трансфармацыю сусветнай фінансавай сістэмы. «Таму, нягледзячы на націск, трэба засяродзіцца на развіцці трансгранічных плацяжоў, фінансаванні гандлю і інвестыцый, у тым ліку ў каапэрацыі з нашымі партнёрамі», — акцэнтаваў увагу кіраўнік беларускага ўрада.

«Еўразійскі эканамічны саюз упэўнена прадаўжае сваё паступальнае развіццё. Перакананы, што адкрытасць і ўзаемавыгаднае эканамічнае супрацоўніцтва было і застанецца асновай нашага інтэграцыйнага аб'яднання», — сказаў на заканчэнне прэм'ер-міністр.

Паводле БелТА.

Блізкая ўлада

МАЁМАСЦЬ, РАМОНТ, ПАДАТКІ, ГРАМАДЗЯНСТВА...

З чым у Докшыцах ішлі да Уладзіміра Андрэйчанкі

На прыёме ў райвыканкаме старшыня Палаты прадстаўнікоў разгледзеў 14 зваротаў. На некаторыя з іх заяўнікам далі тлумачэнні на месцы, усе пытанні ўзяты на кантроль.

Жыхар райцэнтра звярнуўся з пытаннем, як яму афарміць права на валоданне паловай дома, што пасля смерці яго былой жонкі належыць іх дачцэ. Дачка заяўніка пражывае ў Казахстане, дакументы на права атрымання ў спадчыну дома не забірала і не адчужае сваю долю бацьку, бо знаходзіцца з ім у нацягнутых адносінах.

Жыхару вёскі Крыпулі прыйшло паведамленне з падатковай інспекцыі аб выплаце падатку на ўчастак, ад якога, як расказаў мужчына, ён адмовіўся яшчэ ў 2014 годзе. Аднак, паводле афіцыйных дакументаў, гэты ўчастак за ім яшчэ лічыцца. Прадстаўнікі сельвыканкама паведамілі, што з такой заявай вясковы жыхар да іх не звяртаўся.

Заяўніца з Бягомля жадае пашырыць жылплошчу. Яна пражывае з пяццю дзецьмі і маленькай унучкай у двухпакаёвай кватэры. Жанчына хоча пабудаваць яшчэ адну кватэру ў родным гарпасёлку.

Жанчына, якая з 2000 года пражывае ў арэндным доме ў вёсцы



Вітунічы, за свой кошт рабіла ў ім рамонт: там уцяплілі сцены, падлогу, замянілі печку і электраправодку. Яна раней звярталася на сельгаспрадпрыемства, на балансе якога знаходзіцца дом, каб яе вызвалілі ад выплат за капрамонт. Таксама заяўніца хадайнічала аб перадачы жылля ў яе ўласнасць.

Былая жыхарка Украіны, якая з 2014 года пераехала ў Беларусь і пражывае ў аграгарадку Параф'янава, падала ў лютым мінулага года заяву на атрыманне беларускага грамадзянства. Яна папрасіла старшыню Палаты прадстаўнікоў пасадзейнічаць у паскарэнні працэсу атрымання грамадзянства.

З пытаннямі садзейнічання ў развіцці і пашырэнні бізнесу на асабісты прыём прыйшлі прадстаўнікі мясцовай швейнай мануфактуры і грамадзянін Расіі. Кіраўнікі швейнай вытворчасці хацелі б атрымаць на бязвыплатнай аснове пад рэалізацыю інвестпраекта будынак былой крамы, аднак Беларускі рэспубліканскі саюз спажывецкіх таварыстваў адмовіў ім, бо дадзеную нерухомую маёмасць збіраюцца прадаць. Расіянін плануе пашырыць вытворчасць металавырабаў, арганізаваную ў былым санаторыі «Вечалле» ва Ушацкім раёне, і стварыць інжынерна-тэхнічны цэнтр для падрыхтоўкі моладзі да работы на сучасным абсталяванні, у тым ліку на лазерных станках. У Санкт-Пецярбургу ён мае аналагічнае прадпрыемства. Уладзімір Андрэйчанка адзначыў, што арганізуе сустрэчу расіяніна з міністрам энергетыкі, каб яны абмеркавалі, якія магчымасці ёсць для заяўніка ў пашырэнні сферы дзейнасці.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў таксама разгледзеў прапанову па адпачынку моладзі, пытанні падтаплення зямельнага ўчастка падчас адлігі і дажджоў, працаўладкавання, асартыменту аўтакрамы і даў адпаведныя даручэнні мясцовай уладзе.

БелТА.

КІБЕРМАХЛЯРОЎ АДЛОЎЛІВАЮЦЬ ЦЭЛЫМІ «ПАЧКАМІ»

ЗЛАЧЫННАЯ ПАВУЦІНА Ў СЕТЦЫ

Як расказаў **начальнік Галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці Міністэрства ўнутраных спраў Андрэй КАВАЛЁЎ,** напрыканцы мінулага года супрацоўнікі МУС выкрылі чарговую групу кібермахляроў.

Адказваючы на пытанне аб прычыненай шкодзе і колькасці пацярпелых, Андрэй Кавалёў паведаміў, што на гэты момант вядома аб некалькіх тысячах пацярпелых. «Мы прааналізавалі лічбавыя сляды, якія ляглі ў аснову абвінавачвання. Гаворка ідзе аб злачынствах 2020—2022 гадоў і нават больш позніх. Пацярпелых тысячы, і гаворка ідзе не толькі аб грамадзянах Беларусі, але і аб нашых найбліжэйшых суседзях. Перш за ўсё гэта Расія і краіны СНД. І колькасць пацярпелых расце. Чым больш мы ўстанаўліваем фігурантаў, тым большая колькасць пацярпелых», — заявіў Андрэй Кавалёў.

НЕ КОЖНАЯ ПЛЯЦОЎКА БЯСПЕЧНАЯ І КАРЫСНАЯ

У аднаго з затрыманых непаўналетніх удзельнікаў злачыннай супольнасці было больш за дзесяць уліковых запісаў у адным з месенджараў. У цяперашні час супрацоўнікамі па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці на беларускай інтэрнэт-пляцоўцы па продажы тавараў заблакіравана больш за 30 тысяч профіляў, якія належаць ашуканцам. Міліцыянеры актыўна ўзаемадзейнічаюць з прадстаўнікамі тэхнічнай падтрымкі рэсурсу, дзякуючы чаму злачынствы атрымліваецца не толькі выяўляць, але і папярэджваць.

ЗЛАЧЫННАСЦЬ МАЛАДЗЕЕ

Паводле слоў Андрэя Кавалёва, днямі МУС сумесна са Следчым камітэтам затрымалі чарговую групу кібермахляроў. Зламыснікі ўваходзілі ў склад міжнароднай скам-супольнасці, арганізатараў якой праваахоўнікі затрымалі ў снежні мінулага года.

«На жаль, узрост злачынцаў маладзее, і мы павінны канстатаваць, што самаму малодшаму на момант здзяснення злачыннай дзейнасці было 13 гадоў. Галоўная задача МУС — гэта не заводзіць крымінальныя справы ў дачыненні да дзяцей або прыцягваць іх да адказнасці. Перш за ўсё мы павінны данесці да бацькоў і іх дзяцей, што за тыя ці іншыя злачынствы прадугледжана крымінальная адказнасць, часам вельмі суровая», — сказаў Андрэй Кавалёў. А дзеці матываваным адным — хуткім заробкам і ўяўным пачуццём, што інтэрнэт ананімны, што ім за гэта не будзе ніякай адказнасці, што іх не пазнаюць.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як мяркуецца, уся злачынная група складаецца з больш як 1 тысячы ўдзельнікаў. Супрацоўнікі праваахоўных органаў змаглі ўстанавіць не толькі радавых выканаўцаў, але і арганізатараў. «На сёння мы выявілі каля пяці звёнаў арганізаванай злачыннай групы. Задача ў тым, каб выкрыць максімальную колькасць удзельнікаў», — заявіў начальнік Галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці Міністэрства ўнутраных спраў.

ЧЛЕНЫ ГРУПЫ НЕ ВЕДАЮЦЬ АДЗІН ПРА АДНАГО, АЛЕ ГЭТА ІХ НЕ РАТУЕ

Пра падрабязнасці дзейнасці затрыманых удзельнікаў злачыннай групы журналістам распавёў **намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці Міністэрства ўнутраных спраў Аляксандр РЫНГЕВІЧ.**

Як адзначыў спецыяліст, спецыфіка падобнага роду злачынстваў заключаецца ў тым, што яны не здзяйсняюцца адным чалавекам. «Гэта заўсёды дзейнні арганізаванай злачыннай групы, і яе ўдзельнікі часцяком могуць не ведаць адзін аднаго. Выканаўцы ўступаюць у зносіны з нашымі грамадзянамі, падманваюць іх, а іншыя ўдзельнікі даюць адпаведныя інструменты. Гэта могуць быць сім-карты, акаўнты ў месенджарах або на гандлёвых пляцоўках», — сказаў Аляксандр Рынгевіч.

Супрацоўнік МУС адзначыў, што на гэты момант выкрытая непасрэдная вярхушка злачыннай групы. Гаворка ідзе аб распрацоўшчыках, якія займаліся тэхнічным суправаджэннем, пры гэтым застаючыся ў цені. Па словах Аляксандра Рынгевіча, усе ўдзельнікі злачыннай групы знаходзяцца ў цеснай узаемасувязі. «Вядома, радавых выканаўцаў значна больш. Яны лічаць, што не будуць устаноўлены, таму што інтэрнэт ананімны і выкарыстанне розных інструментаў для ўтойвання IP-адрасоў або нумароў тэлефонаў дапаможа ў гэтым. Але, працуючы па верхавіне гэтай супольнасці, мы атрымалі дастаткова звестак, якія дазволілі ідэнтыфікаваць беларускіх грамадзян і не толькі», — падкрэсліў супрацоўнік МУС.

СЯМЁРКА ФІШЫНГАВЫХ ПАКУПНІКОЎ

Што датычыцца затрымання, якое адбылося літаральна некалькі дзён таму, то ў поле зроку трапіла група, якая складаецца з сямі чалавек, што пражываюць у пяці абласцях Беларусі і Мінску. «Чатыры чалавекі з сямі непаўналетнія. Некаторым з затрыманых ужо прад'яўлены канкрэтныя абвінавачванні.

Яны ўступалі ў зносіны з нашымі грамадзянамі, якія жадалі прадаць той ці іншы тавар. Пасля непрацяглых кантактаў у месенджары грамадзянам прапаноўвалі перайсці па спасылцы, якая аказвалася фішынгавай. Потым пацярпелыя паказвалі рэквізіты сваіх банкаўскіх картак, і ашуканцы выкрадалі іх сродкі», — распавёў аб злачыннай схеме Аляксандр Рынгевіч. Супрацоўнік МУС дадаў, што менавіта гэтым займаліся затрыманыя. Яны ўступалі ў перапіску з грамадзянамі з мэтай іх падману.

У міліцыі запэўніваюць, што ў найбліжэйшы час затрыманні ўдзельнікаў буйной скам-супольнасці пачнуцца і за мяжой. Узбуджана больш за паўтары тысячы крымінальных спраў.

Сума шкоды ад дзеянняў гэтай групы толькі сярод беларусаў перавышае тры мільёны рублёў. Злачынствы здзяйсняліся з 2020 года, калі з-за пандэміі каранавіруса адбыўся ўсплёск анлайн-продажаў.

У ЦЭНТРАЛЬНЫМ РЭГІЁНЕ — УПОР НА ПРАФІЛАКТЫКУ

Днямі ва ўпраўленні ўнутраных спраў Мінскага аблвыканкама адбылася калегія з удзелам **міністра ўнутраных спраў Івана КУБРАКОВА,** на якой абмеркавалі работу з уразлівымі катэгорыямі грамадзян і прафілактыку махлярстваў.

Падчас абмеркавання аператыўнай абстаноўкі міністр акцэнтаваў увагу на працы з уразлівай катэгорыяй грамадзян. На яго думку, участковыя інспектары павінны ставіцца да пажылых людзей як да ўласных бацькоў, вырашаючы іх праблемы і выяўляючы клопат.

На калегіі адзначылі, што павышанай увагі патрабуюць пытанні прафілактыкі махлярстваў і кіберзлачынстваў.

Па выніках аператыўна-службовай дзейнасці за 2022 год найлепшымі падраздзяленнямі Мінскай вобласці прызнаныя Капыльскі і Салігорскі РАУС.

А НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ КОЛЬКАСЦЬ КІБЕРЗЛАЧЫНСТВАЎ ЗНІЗІЛАСЯ

Аб гэтым паведаміў **начальнік УУС Гомельскага аблвыканкама Аляксандр ШАСТАЙЛА.** «Што датычыцца процідзеяння кіберзлачыннасці, то ў Гомельскай вобласці за 2022 год зарэгістравана 1917 злачынстваў названага віду. У тым ліку 71 — катэгорыі цяжкіх і асабліва цяжкіх, з іх ужо раскрыта 22. У 2021 годзе было 1947 злачынстваў, 37 цяжкія і асабліва цяжкія», — сказаў Аляксандр Шастайла.

На яго думку, знізіць колькасць злачынстваў па гэтым напрамку ўдалося ў тым ліку дзякуючы актыўнай, нават агрэсіўнай, прафілактычнай рабоце з насельніцтвам.

Разам з тым, звярнуў увагу начальнік УУС, нямала выпадкаў, калі людзі станавіліся ахвярамі ашуканцаў, размяшчаючы або адгукаючыся на розныя аб'явы на гандлёвых інтэрнэт-пляцоўках. «Пацярпелыя ўваходзяць у кантакт са злачынцамі, перадаюць ім рэквізіты банкаўскіх картак, а затым з гэтых рахункаў выкрадаюцца значныя сумы. Пры гэтым сумы, якія перадаюць злачынцам пацярпелыя, дасягаюць тысяч рублёў», — адзначыў начальнік УУС Гомельскага аблвыканкама.

Інфармацыйныя тэхналогіі развіваюцца з кожным годам, а кіберзлачынцы рэгулярна відазмяняюць свае злачынныя схемы, выкарыстоўваючы сучасныя тэхналогіі, падкрэсліў Аляксандр Шастайла. Людзі ж вельмі даверлівыя, таму і становяцца ахвярамі кібермахляроў. Па словах начальніка УУС, іх супрацоўнікі пастаянна распавядаюць жыхарам рэгіёна аб тым, як не трапіць на вуду ашуканцаў, у тым ліку і ў інтэрнэце. «Усе намаганні накіраваны на тое, каб ліквідаваць лічбавую неадукаванасць людзей, зберагчы іх ад злачынных замахаў», — сказаў ён.

«Галоўнае, што можна параіць грамадзянам, — быць пільнымі. Так, трэба выкарыстоўваць новыя тэхналогіі, яны ўжо ўвайшлі ў наша паўсядзённае жыццё, але заўсёды важна памятаць аб мерах бяспекі. Калі ёсць пэўныя сумневы, то не трэба пераходзіць ні па якіх інтэрнэт-спасылках, паведамляць персанальныя данныя, звесткі аб сваіх рахунках, пін-коды і іншую інфармацыю», — рэкамендаваў Аляксандр Шастайла.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Аўстраліі створаць адзіны дзяржрэестр агнястрэльнай зброі

Стварэнне агульнадзяржаўнага рэестра агнястрэльнай зброі з'яўляецца неабходнай мерай для гарантавання бяспекі ў Аўстраліі. Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр краіны Энтані Альбанэзэ, паведаміла ТАСС. «Федэральны ўрад павінен больш цесна супрацоўнічаць з рэгіянальнымі ўладамі, калі размова заходзіць аб агнястрэльнай зброі», — сказаў прэм'ер. Ён таксама паведаміў, што ў найбліжэйшы час генеральны дырэктар нацыянальнай службы бяспекі і разведкі (ASIO) Марк Берджэс прадставіць ураду «справаздачу аб павелічэнні колькасці выпадкаў праявы правага экстрэмізму» і іншых унутраных праблемах. Падставай для такога рашэння Альбанэзэ назваў нядаўні інцыдэнт са стральбой, у выніку якога двое супрацоўнікаў паліцыі загінулі і яшчэ двое атрымалі раненні. Перастрэлка адбылася ў снежні мінулага года ў штаце Квінсленд. Нападаючыя, якія аказаліся прыхільнікамі тэорыі перавагі белай расы, былі забіты пры затрыманні.

У машыніста метро ў Мехіка запатрабавалі 14 мільёнаў долараў пасля аварыі

Сістэма калектыўнага транспарту Мехіка, якая кіруе сталічнай падземкай, запытала ў судзе кампенсацыю ў машыніста цягніка, які трапіў у аварыю ў пачатку студзеня, у памеры 260 мільёнаў песа (каля 14 мільёнаў долараў), паведаміла газета Universal. Два цягнікі сутыкнуліся на трэцяй лініі метро Мехіка паміж станцыямі Ла-Раса і Патрэра ў цэнтры горада 7 студзеня. У аварыі загінула маладая жанчына, яшчэ 57 чалавек атрымалі раненні. Адной з прычын сутыкнення цягнікоў папярэдне назвалі перавышэнне машыністам бяспечнай хуткасці, якая складае 35 км за гадзіну і дае магчымасць у непрадбачаных сітуацыях спыніць састаў без рызыкі для пасажыраў. Са спасылкай на адваката машыніста Universal паведаміла, што з запытанай сумы на кампенсацыі пацярпелым і сям'і загінулай прадугледжана толькі 120 тысяч песа. Астатнія 259,8 мільёна песа з'яўляюцца кампенсацыяй за шкоду саставу, пуцям і інжынерным збудаванням падземкі.

Сурок Філ прадказаў познюю вясну

Амерыканскі «народны метэаролаг» сурок Філ з мястэчка Панксатоні ў штаце Пенсільванія прадказаў, што вясна сёлета настане позна. Трансляцыя штогадовага мерапрыемства, якое праходзіла гэтым разам без гледачоў і пры выкананні санітарных абмежавальных нормаў, праводзілася на сайце мясцовага «Клуба сурка», паведаміла ТАСС. Пяцікілаграмовы Філ быў выняты раніцай са сваёй нары на ўзгорку Гоблер-Ноб. Згодна з народным павер'ем, калі сурок пужаецца свайго ценю і хаваецца ў нару, то зіма прадоўжыцца яшчэ паўтара месяца. Калі ж надвор'е воблачнае і Філ не бачыць свайго ценю, то чакаецца ранні прыход вясны. Прагноз абвясціў Джэф Ландзі — прэзідэнт так званага Унутранага кола, які аб'ядноўвае тых мясцовых жыхароў, хто на працягу многіх гадоў выконвае гэтую традыцыю. Ландзі ад імя Філа канстатаваў, што ранняй вясны сёлета чакаць не даводзіцца: «Яшчэ шэсць тыдняў зімы».

Год міру і стварэння

АДЧЫНІЦЬ ПРАЗ ЧВЭРЦЬ СТАГОДДЗЯ

Уладзімір Каранік узяў удзел у цырымоніі закладкі «Капсулы міру» ў гарадскім пасёлку Мір

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама перадаў капсулу з пасланнем да нашчадкаў музею замкава-паркавага комплексу «Мір», дзе яна будзе захоўвацца 25 гадоў. Прачытаць пісьмо змогуць прадстаўнікі будучага пакалення.

Фота БелТА.

Гарадскі пасёлак Мір невыпадкова абраны месцам урачыстай цырымоніі. Як адзначалася падчас мерапрыемства, назва пасёлка сугучная характару паслання. Як і заснавальнікі населенага пункта, іх сённяшнія нашчадкі імкнуцца захаваць такі стан і звяртаюцца з гэткім жа наказам да будучага пакалення.. Сімвалічна і само месца захоўвання капсулы. Мірскі замак, пабудаваны ў XVI стагоддзі, неаднаразова цярпеў ад разбуральных войнаў, але, дзякуючы намаганням сучаснікаў, адноўлены.

— Гэта паказвае беражлівае стаўленне краіны да здабыткаў нашых продкаў і з'яўляецца яркай дэманстрацыяй імкнення нашай краіны да будучыні, абапіраючыся на свае карані, — адзначыў Уладзімір Каранік. — Мы спадзяёмся, што наступная чвэрць стагоддзя пройдзе ў нашай краіне пад знакам міру і стварэння, а нашчадкі працягнуць такую справу і надалей і пры гэтым будуць імкнуцца да новага, не спыняючыся ў развіцці.

Губернатар падкрэсліў: важнасць падзеі яшчэ і ў тым, што яна супала з 80-й гадавінай разгрому нямецка-фашысцкіх войскаў у Сталінградскай бітве, якая стала пераломным момантам Вялікай Айчыннай вайны.

— Амаль 80 гадоў Беларусь жыве пад мірным небам, але за гэту магчымасць заплачана высокая цана, і мы спадзяёмся, што крывапралітныя бітвы, войны засталіся ў гісторыі, якую мы будзем памятаць і шанаваць і якая не павінна паўтарыцца на нашай зямлі, — канстатаваў Уладзімір Каранік.

Ён выказаў упэўненасць, што маладыя ўдзельнікі цырымоніі прыйдуць сюды праз 25 гадоў, каб у такой жа ўрачыстай абстаноўцы агучыць пасланне, да якога яны таксама маюць дачыненне. Напрыклад, навучэнцы Мірскага дзяржаўнага каледжа Мікіта Жыгала і Дар'я Мінцкевіч удзельнічалі ў выбары капсулы. Абое — выдатнікі вучобы, удзельнікі і дыпламанты рэгіянальных, рэспубліканскіх конкурсаў і фестываляў. Мікіта асвойвае спецыяльнасці рэстаўратара і тынкоўшчыка, Дар'я — будучы кераміст, яна прыгожа аформіла капсулу, у якую было ўкладзена пасланне. Мікіта расказаў, што дадзеная місія вельмі важная для яго, бо гаворка ідзе пра будучыню. Зразумела, ён не ведае, дзе можа апынуцца праз 25 гадоў, але пры магчымасці абавязкова возьме ўдзел у цырымоніі адчынення капсулы. Яму ў той час будзе 43 гады.

— Гэта вельмі цікавая і важная традыцыя — адрасаваць падобныя пасланні будучым пакаленням, перадаваць свае пажаданні і мары. Сёння моладзь імкнецца да шчаслівага, а значыць, мірнага жыцця, — выказаў думку Мікіта.

Удзельнікі ўрачыстасці звярнулі ўвагу на важнасць традыцыйных каштоўнасцяў, пераемнасці і сувязі пакаленняў. Будучыня, як вядома, у руках маладых. Яны павінны забяспечыць гарманічнае і стабільнае развіццё нашай краіны.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Выставы

ПАД КРЫЛЫ БУСЛОЎ, ДА ВАШЧАНКІ

«Каб любіць Беларусь нашу мілую...», неабавязкова ехаць далёка. Гэта мог бы растлумачыць народны мастак Беларусі Гаўрыла Вашчанка. Сёлета майстру споўнілася б 95 гадоў, яго ўжо няма з намі. Але душа, здаецца, недзе тут. Прынамсі, яе адчуваеш у Палацы мастацтва на выстаўцы «Дынастыя», дзе прадстаўлены творы заснавальніка творчага роду і яго нашчадкаў.

Калі задумацца, з якой птушкай атаясамліваецца душа беларуса, то экспазіцыя падкажа адказ — менавіта дзякуючы творам Гаўрылы Вашчанкі. А ён вельмі шмат маляваў буслоў. Птушка надзеі, птушка жыцця. Птушка яго радзімы, дзеля якой ён вельмі плённа працаваў, пакінуўшы шмат твораў, якія знаходзяцца ў калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, у Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў, у калекцыі сям'і. І цяпер яны сабраліся ў адной экспазіцыі побач з творамі сына Канстанціна і ўнучкі Ангеліны. Тры пакаленні мастакоў, а такое ўяўленне, што распавядаюць пра адно, толькі парознаму.

Гаўрыла Харытонавіч. Па-першае, адметны яго маштаб — нават у памерах карцін. Асабліва ў тых, што прысвечаны яго роднаму Палессю. Заспакаяльнасць краявідаў і размераны рытм колераў — ад веры ў тое, што гэтая зямля здолее перажыць усё і ўзняцца нават пасля трагедый, звязаных з вайной ці «мірным» атамам. Ён адчуваў і адлюстроўваў Беларусь — і на ўзроўні сімвалаў, і на ўзроўні выбару колераў, і на ўзроўні асаблівага духу. Відаць, гэта было засвоена з дзяцінства, якое прайшло на Гомельшчыне, і не адпускала, калі паехаў вучыцца мастацтву ў Кіеў, а пасля ў Львоў. Між іншым той перыяд быў карысны не толькі для самога мастака, але і для ўсёй Беларусі, бо, навучыўшыся сам, ён прыедзе ў Мінск і створыць кафедру манументальнага мастацтва, у яго будуць вучыцца шмат вучняў, сярод якіх цяпер ужо таксама ёсць народныя мастакі Беларусі.

Але не манументальнасць твораў Гаўрылы Вашчанкі здзівіць на гэтай выстаўцы, а менш вядомыя яго работы, якія знаходзяцца ў калекцыі сям'і і рэдка выстаўляліся раней. Яны таксама беларускія па сутнасці — па тэмах, сюжэтах і па цеплыні, якую выпраменьваюць. Па крохкасці захаваных імгненняў. Якія ён нібыта ўхапіў захопленым поглядам і назаўжды захаваў не толькі ў сваёй памяці. Тут Гаўрыла Вашчанка паўстае такім, якім яго шмат хто не ведаў і не мог уявіць.

Канстанцін Гаўрылавіч. Той момант, калі лепш глядзець самі творы, чым гаварыць пра іх. Абраў уласны шлях у мастацтве, адрозны ад бацькавага, — стаў мастаком-графікам. Але працуе ў жывапісе, у фотамастацтве, стварае арт-аб'екты... Яго мастацтва — на цяперашні час, калі больш важкай становіцца думка, а выяўленне толькі імкнецца яе падкрэсліць. Але і ў яго думкі пра наша, роднае, беларускае. І нават без работ са знакамітага скарынаўскага праекта яго клопат зразумелы: гэта роздум пра чалавека і свет, які яго атачае, — цалкам наш, асветніцкі падыход.

Ангеліна Канстанцінаўна. Унучка Гаўрылы Вашчанкі, як і яе бацька, абрала графіку. Вучыцца ў Акадэміі мастацтваў і ўжо не першы раз выстаўляецца. Сярод яе афортаў і літаграфій вылучаецца адна работа, якая мае сімвалічную назву «Натхненне». На ёй можна пазнаць яе знакамітага дзеда. Род сапраўды натхняе — і гэта так па-беларуску...

Ларыса ЦІМОШЫК.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

Часопісы ў студзені: «Маладосць»

«Я — ТОЛЬКІ ЗЯРНЯТКА...»

Першы нумар «Маладосці» за 2023 год адкрываецца вершамі студэнткі першага курса філалагічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна Ірыны МАКАРЧУК. У чатырох творах — і «ціхі ветрычак вясні», і белая птушка, «што ў пастцы канала»... Паэт шукае сябе і клікае ў сваю творчасць розны вопыт жыцця. Свайго і чужога. Вершы прыцягваюць і прымушаюць разважаць. Якраз гэтага штуршка ў зносінах творцы з чытачом часам і не хапае. *«...Была я агнём, і вадой, і туманам, // У стэпе паважным была каравanам. // Прайшла сотні жыццяў, // Знайшоўшы сябе. // Я — толькі зярнятка // У Божай сяўбе»*. Плёну Ірыне і новых адкрыццяў, пільнага ўзірання ў жыццё!..

Вядомы празаік Людміла РУБЛЕЎСКАЯ выступае ў часопісе з падборкай апавяданняў «Чатыры калоны» — несумненна, творы знакамітай працаўніцы на ніве мастацкай літаратуры нельга абмінуць. Таццяна КУРМАЗІЯ, якая нарадзілася ў Петрыкаве, на Гомельшчыне, знаёміць чытача з падборкай вершаў «Неўтаймоўнага мора чысты выток». Вершы ў асноўным пра любоў... *«Ён кахае цябе, як ніхто не кахаў ніколі, — // Гэты смешны хлапчук у расхрыстаным паліто. // Ты смяешся гарэзліва, потым з тугой міжволі // Схамянешся ад думкі: «А ён для мяне — ніхто»*.

У студзеньскім нумары — і аповесць Вольгі ЛІХАДЗІЕЎСКАЙ (нарадзілася ў Мінску ў 1992 годзе, працуе настаўніцай у школе) «Дзіцячае памежжа». Яе пачатак — у адзінаццатым нумары «Маладосці» за 2022 год.

З падборкай вершаў «Тры жаночыя партрэты» выступае ў «Маладосці» любімы беларускімі чытачамі паэт і празаік Алесь БАДАК. Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ аддае на суд усіх, хто адкрые першы нумар «Маладосці», апавяданне «Дзе я..?»

Соф'я ШАХ са Светлагорска, якую добра ведаюць як аўтара многіх вянкоў санетаў, не здраджвае свайму любімаму жанру і прадстаўляе чытачу «вянок санетаў безгалова-хвастаты» «Духавышыня». Падборка паэтычных твораў Дзяніса МАЦЕШЫ (нарадзіўся ў Паставах, жыве ў Мінску) называецца: «Дотыкі ніколі не змаўкаюць...» Кароценькі верш з чатырох радкоў у гэтай падборцы называецца «Разам»: *«Дотыкі ніколі не змаўкаюць — // Целаў блізкасць, абяцанні «назаўжды»... // Нараджаюцца і зноўку паміраюць // Літары — пачуццяў галасы»*.

Застаецца ў палоне сваіх ранейшых творчых зацікаўленняў кандыдат філалагічных навук з Віцебска Ганна НАВАСЕЛЬЦАВА — «Маладосць» друкуе яе міфаказку «Сказ пра Лесю». А Святлана БЯЗЛЕПКІНА (магчыма, чытач памятае яе па кнізе прозы «Чарнобыльская русалка») выступае з апавяданнем «Апошні шанц».

Па традыцыі ёсць у студзеньскім нумары і пераклады: «Краіну сляпых» Герберта УЭЛСА пераклаў на беларускую мову Кірыл БУЛАЙ, студэнт 4 курса Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта.

Багаты нумар і на публіцыстычныя, літаратурна-крытычныя матэрыялы. У раздзеле «Люстэрка лёсу» — урыўкі з кнігі доктара педагагічных навук Аляксандра РАДЗЬКОВА «Пра матэматыку і матэматыкаў». У хуткім часе кніга пабачыць свет асобным выданнем у выдавецтве «Мастацкая літаратура». Вучоны і публіцыст разважае пра шэдэўры матэматычнай думкі, нагадвае айчыннаму чытачу, наколькі інтэлектуальна багатая ў нас краіна. Кастусь ЛАДУЦЬКА знаёміць чытача з забытым калекцыянерам экслібрысаў — магілёўскім інжынерам Мікалаем ВЕЛІКАНАВЫМ. Яго збор цяпер захоўваецца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі.

Мікола БЕРЛЕЖ.

КРЫВАВЫ ВЭРХАЛ

Што адбываецца ў ЗША?

На працягу мінулага месяца ў інцыдэнтах са стральбой у ЗША загінуў 1541 чалавек. У краіне зафіксавана звыш паўсотні масавых расстрэлаў, калі ў выніку кожнага такога здарэння пацярпела больш за чатыры чалавекі. У выніку загінула 87 чалавек і звыш 180 паранена. Гэта больш, чым за аналагічны перыяд мінулых гадоў за ўсю гісторыю рэгістрацыі адпаведных фактаў. Такую статыстыку сабраў спецыялізаваны партал Gun Violence Archive (дзе рэгіструецца статыстыка па гвалце з ужываннем агнястрэльнай зброі). У выніку стральбы ў ЗША ў студзені ад куль загінулі 22 дзіцяці, 44 пацярпелі. З агнястрэльнай зброі былі забіты 124 падлеткі, 295 атрымалі раненні. Раней стала вядома, што грамадскія арганізацыі звярнуліся да прэзідэнта ЗША з просьбай увесці агульнанацыянальны рэжым надзвычайнай сітуацыі ў сувязі з рэзкім павелічэннем выпадкаў узброенага гвалту. Днямі Джо Байдэн заявіў, што краіна сутыкнулася з такім ростам узброенага гвалту, які патрабуе рашучых дзеянняў ад уладаў. Паводле яго слоў, за кароткі час у ЗША адбываліся трагедыя за трагедыяй. Байдэн зноў заклікаў кангрэс увесці забарону на продаж штурмавой зброі і магазінаў вялікай ёмістасці для зброі, а таксама адобрыць ініцыятыву, якая павышае ўзрост для іх набыцця да 21 года. Што ж адбываецца ў ЗША?

ПІСТАЛЕТ ДЛЯ НЕМАЎЛЯЦІ

Другая папраўка да Канстытуцыі ЗША (прынята ў 1791 годзе) гарантуе права амерыканцаў валодаць агнястрэльнай зброяй. Існуе шэраг федэральных законаў, які рэгулюе парадак валодання і выкарыстання агнястрэльнай зброі, аднак большую частку правілаў такога кшталту вызначаюць асобныя штаты ЗША. З 1986-га забаронена прадаваць цалкам аўтаматычную зброю (аднак тыя ж аўтаматы, кулямёты, выпушчаныя да 1986-га, могуць заставацца ў валоданні людзей і прадавацца імі прыватным парадкам). У 1994-м было ўведзена яшчэ адно абмежаванне — магазіны хуткастрэльных вінтовак не павінны ўмяшчаць больш за 10 патронаў (адпаведна, дазваляецца валодаць і перапрадаваць прыватным чынам магазіны, набытыя да 1994 года).

У 46 штатах не існуе абмежаванняў на набыццё колькасці стваловў. Толькі ў чатырох штатах дзейнічае правіла, паводле якога пакупнік можа набыць адну адзінку (пісталет, вінтоўку і іншае) на месяц. У 43 штатах набыццё зброі не патрабуе атрымання ліцэнзій або рэгістрацыі. У 44 штатах ніякім чынам не рэгулюецца другасны рынак зброі (гэта значыць, уладальнік пісталета можа свабодна прадаць яго любому). У 27 штатах пакупніка правяраюць не толькі па федэральнай базе даных злачынцаў, але і па базах даных самога штата (адпаведна, у астатніх 23 штатах падобны запыт адсылаецца толькі федэральным уладам). Сорак штатаў забараняюць графствам і асобным муніцыпалітэтам прымаць законы, якія ўзмацняюць жорсткасць або змякчаюць існуючыя правілы.

У сямі штатах ЗША (з 50) не існуе ўзроставых абмежаванняў для набыцця зброі ў прыватных прадаўцоў. Васямнаццаць штатаў не ўстанаўліваюць мінімальнага ўзросту валодання агнястрэльнай зброяй (гэта значыць, фармальна пісталетам можа валодаць і немаўля). Яшчэ 13 штатаў дазваляюць валодаць зброяй падлеткам ва ўзросце 13—16 гадоў. Толькі ў чатырох штатах ЗША існуюць заканадаўчыя акты, якія ўстанаўліваюць, што асабістая зброя павінна захоўвацца ў спецыяльна абсталяваным, бяспечным месцы (напрыклад, у сейфе).

У 2000 годзе Open Society Institute упершыню параўнаў «зброевыя» нормы, якія існуюць у розных штатах ЗША. Максімальна жорсткае заканадаўства магло атрымаць 100 балаў. Даследаванне паказала, што найбольш суровыя правілы дзейнічаюць у Масачусетсе (атрымаў 76 балаў) і на Гаваях (71 бал). Яшчэ шэсць штатаў (Нью-Ёрк, Ілінойс, Нью-Джэрсі, Мэрыленд, Канектыкут і Каліфорнія) маюць «умераныя» правілы (набралі ад 27 да 53 балаў). Сорак два штаты набралі менш за 20 балаў, прычым 20 з іх набралі менш за нуль: найбольш свабодныя правілы валодання агнястрэльнай зброяй у штатах Мэн (мінус 10 балаў), Луізіяна і Аляска (па мінус 8).

Паводле звестак Нацыянальнай канферэнцыі заканадаўцаў Штатаў National Conference of State Legislatures, 38 штатаў ЗША забаранялі пранос зброі на тэрыторыю школы. Яшчэ 16 устанавілі такую забарону ў дачыненні да ўніверсітэцкіх кампусаў (студэнцкіх гарадкоў). Некаторыя штаты пакідалі гэтыя правілы на ўніверсітэты.

ПАЎСОТНІ СМЕРЦЯЎ ШТОДНЯ

Згодна са статыстыкай, ЗША з'яўляецца краінай з самым высокім у свеце каэфіцыентам валодання зброяй. Так, паводле звестак за 2021 год, на 100 чалавек насельніцтва прыпадала больш за 120 адзінак зброі. Амерыканскі прэзідэнт распавёў, што ў яго дома захоўваюцца чатыры драбавікі,

у тым ліку дзве стрэльбы. Дарэчы, кандыдат на пасаду губернатара штата Кентукі Джэфры Янг заявіў аб тым, што Джо Байдэн з'яўляецца ваенным злачынцам. Ён адзначыў, што Байдэн нясе адказнасць за гібель вялікай колькасці людзей, а значыць, павінен быць адхілены ад сваёй пасады. Янг звярнуў увагу на тое, што амерыканскі прэзідэнт сваімі дзеяннямі заахвочвае масавыя забойствы. Янг лічыць, што ўсіх злачынцаў неабходна выгнаць з Белага дома.

Gun Violence Archive пачаў весці статыстыку масавай стральбы ў ЗША ў 2014 годзе. Тады было зарэгістравана 273 падобныя інцыдэнты. Колькасць масавых расстрэлаў у ЗША няўхільна расце. У 2021 годзе ў ЗША адбылося ўжо 690 масавых растрэлаў — рост больш як на 250 працэнтаў! Згодна са статыстыкай, у Штатах штодня ад агнястрэльнай зброі гіне больш за паўсотні чалавек.

Узровень смяротнасці ад выкарыстання агнястрэльнай зброі ў Злучаных Штатах дасягнуў у 2021-м самых высокіх паказчыкаў за апошнія 30 гадоў. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на справаздачу Гарвардскай медыцынскай школы. Усяго з 1990 да 2021 года ад агнястрэльнай зброі загінула больш за 1,1 мільёна амерыканцаў. Адзначаецца, што ў параўнанні з 2019 годам колькасць смяротных зыходаў у выніку прымянення агнястрэльнай зброі ўзрасла на 20 працэнтаў, пры гэтым колькасць загінулых жанчын узрасла на 71 працэнт, а мужчын — на 45 працэнтаў.

У Злучаных Штатах летась адбыліся тысячы інцыдэнтаў са стральбой, ахвярамі якіх стала больш за 43,6 тысячы чалавек, у тым ліку 1,6 тысячы дзяцей. Аб гэтым паведамляе ТАСС са спасылкай на даследчую арганізацыю Gun Violence Archive. Адзначаецца, што на працягу мінулага года ў розных інцыдэнтах з прымяненнем агнястрэльнай зброі было паранена звыш 37,9 тысячы чалавек. Сярод іх 4,4 тысячы дзяцей.

Раней Вашынгтонскі ўніверсітэт апублікаваў справаздачу, паводле якой больш за 6 мільёнаў жыхароў ЗША ў 2019 годзе штодня насілі з сабой зараджаную зброю. Гэты паказчык у два разы вышэйшы, чым у 2015 годзе. Як удакладняецца, такі рост можа быць звязаны з тым, што ў шматлікіх амерыканскіх штатах прымаліся законы, якія аблягчаюць нашэнне зброі ў грамадскіх месцах.

ТРАГЕДЫЯ ЗА ТРАГЕДЫЯЙ

Відавочна, што 2023 год пакіне крывавы след у гісторыі ЗША. Першыя выпадкі масавай стральбы сёлета адбыліся ўжо першага студзеня адразу ў пяці штатах — Пенсільваніі, Паўночнай Караліне, Фларыдзе, Ілінойсе і Агаё, адзначыў inform.kz. Пры гэтым у штаце Фларыда адразу ў двух гарадах — Маямі-Гардэнс і ў Акале. У гэтых інцыдэнтах загінулі тры чалавекі. Адзін чалавек загінуў у Чыкага, штат Ілінойс, і два — у Акале, штат Фларыда. А там, дзе людзі, на шчасце, засталіся жывыя, было шмат параненых. Усяго 1 студзеня пацярпелі 25 чалавек. Далей хваля масавых расстрэлаў пракаціласа па ўсёй краіне. 4 студзеня ў горадзе Сідар-сіці, штат Юта, былі забіты восем чалавек. На наступны дзень страляніна адбылася зноў у Маямі-Гардэнс, у выніку было паранена 10 чалавек.

У студзені адразу тры масавыя расстрэлы адбыліся ў Каліфорніі

ў трох розных гарадах на працягу 44 гадзін. 16 студзеня ў штаце былі забіты шэсць чалавек у выніку масавага расстрэлу. 21 студзеня ў той жа Каліфорніі ў прыгарадзе Лос-Анджэлеса каля Мантэрэй-парку былі забіты 12 чалавек, яшчэ дзевяць былі паранены. Людзі загінулі падчас святкавання месяцовага Новага года. Стралок выпусціў 42 кулі з паўаўтаматычнага пісталета ў танцавальнай зале. Звычайна ў гэты час на святкаванні каля парку збіраецца да 100 тысяч наведвальнікаў. Падазроны ў масавым забойстве застрэліўся ў белым пікапе, які паліцэйскія заблакіравалі ў суседнім з Лос-Анджэлесам горадзе Алхамбра.

Перш чым улады завяршылі гэтае расследаванне, яшчэ сем чалавек былі застрэлены 23 студзеня днём у сельскім мястэчку Халф-Мун-Бі на поўначы Каліфорніі. Ахвярамі сталі рабочыя-імігранты, якія працавалі на ферме. У той жа дзень у горадзе Окленд у раёне заліва Бэй адбылася стральба падчас здымкі музычнага відэа, там знаходзілася да 50 чалавек. Некалькі стралкоў адкрылі страляніну з розных напрамкаў. Раненні атрымалі восем чалавек, з якіх адзін памёр, а астатнія былі шпіталізаваны. Такім чынам, усяго за 44 гадзіны ў штаце былі застрэлены 20 чалавек. Губернатар Каліфорніі Гэвін Ньюсам адрэагаваў на серыю перастрэлак: «На сустрэчы ў шпіталі з ахвярамі масавай стральбы мяне адводзяць, каб паінфармаваць аб іншай масавай стральбе. Трагедыя за трагедыяй...»

ЭФЕКТ «СНЕЖНАГА КАМЯКА»

Французская газета Le Figaro са спасылкай на даклад Міністэрства юстыцыі ЗША апублікавала матэрыял аб вытворчасці агнястрэльнай зброі ў Амерыцы, якая ўзрасла ў тры разы. Паведамляецца, што за апошнія 20 гадоў было выраблена звыш 139 мільёнаў экзэмпляраў стралковай зброі на продаж, 11,3 млн з якіх вырабілі ў 2020-м. Згодна з дакладам, за той жа перыяд у ЗША быў увезены 71 млн адзінак агнястрэльнай зброі, а вывезена 7,5 млн, што прывяло да ўспышкі гвалту з ужываннем стралковай зброі, забойстваў і самагубстваў у краіне. Акрамя таго, узрасла колькасць прадпрыемстваў, якія займаюцца гэтай вытворчасцю. Калі ў 2000 годзе ў краіне дзейнічала ўсяго 2222 прадпрыемствы па вытворчасці зброі, то ў 2020-м іх налічвалася ўжо каля 17 тысяч. Як стала вядома, амерыканская зброевая прамысловасць за апошняе дзесяцігоддзе зарабіла каля мільярда долараў толькі на продажах штурмавых стрэльбаў. New York Times заўважыла, што робіцца гэта праз выкарыстанне і культывацыю іх статусу як амаль міфічных эмблем улады, сімвала звышпатрыятызму і мужнасці.

Адзначаецца, што ўлады ЗША сутыкаюцца са зброяй, якую можна вырабіць у хатніх умовах. У гэтых узораў няма серыйнага нумара і ліцэнзіі на нашэнне, а таксама даведкі аб судзімасці і псіхічным стане пакупніка не патрабуюцца. У адным толькі 2021 годзе паліцыя канфіскавала больш чым 19,3 тысячы адзінак такой зброі.

Нягледзячы на гады фінансавых праблем і ўнутраных разладаў, Нацыянальная стралковая асацыяцыя (NRA) застаецца самым уплывовым зброевым лобі ў Злучаных Штатах, якая мае значны бюджэт для прасоўвання адпаведнай палітыкі ў стаўленні зброі ў Кангрэсе. На працягу некалькіх апошніх выбарчых цыклаў NRA і іншыя арганізацыі ўвесь час выдаткоўвалі больш сродкаў на спробы паўплываць на грамадскую думку, чым іх сапернікі, якія дамагаліся ўзмацнення жорсткасці кантролю над зброяй.У шэрагу штатаў у значнай ступені зняты абмежаванні на тое, хто можа насіць зброю. Напрыклад, у чэрвені 2021 года губернатар Тэхаса Грэг Эбат падпісаў закон, які дазваляе жыхарам штата насіць агнястрэльную зброю без ліцэнзіі або навучання.

Летась Джорджыя стала 25-м штатам, які адмяніў неабходнасць у дазволе на ўтоенае ці адкрытае нашэнне агнястрэльнай зброі. Закон азначае, што любы грамадзянін гэтага штата мае права насіць агнястрэльную зброю без ліцэнзіі ці дазволу. Закон падтрымала NRA, і лідары арганізацыі назвалі яго прыняцце «манументальным для другой папраўкі».

«Федэральным рэгламентным органам варта больш актыўна рэгуляваць маркетынгавую практыку ваеннай прамысловасці, якая з кожным годам становіцца ўсё больш смяротнай і ненармальнай, — заўважыла газета New York Times. — Амерыканцы яшчэ доўга будуць жыць з вялікай колькасцю зброі. Заклікі да канфіскацыі ці нават да яшчэ адной забароны штурмавой зброі добрыя, але намеры зусім не рэалістычныя».

Адам Лэнкфард, крымінолаг з універсітэта Алабамы, апісаў распаўсюджанасць стральбы ў ЗША як пабочны прадукт даступнай зброі і эфектаў перайманння. «Вы можаце думаць аб гэтым як аб эфекце «снежнага камяка», — сказаў ён New York Times. — Чым больш будзе інцыдэнтаў, тым больш заўважным застанецца гэты варыянт у свядомасці разгневаных людзей».

У ЗША не засталося месца, абароненага ад гвалту з ужываннем агнястрэльнай зброі, канстатаваў сенатар штата Каліфорнія Дэвід Мін пасля стральбы ў Мантэрэй-парку. «У мінулым годзе я страціў 15 жыццяў у сваім раёне, — сказаў мэр Рокфарда Том Макнамара. — Проста сумна, што мы жывём у краіне, дзе гвалт нармалізаваўся». Так што крывавы вэрхал у Штатах, мяркуючы па ўсім, будзе, на жаль, працягвацца.

Захар БУРАК.

У БАЯХ ЗА СТАЛІНГРАД

Малавядомыя старонкі біяграфіі намесніка камандуючага Сталінградскага і Данскога франтоў генерал-лейтэнанта Кірыла Каваленкі

У час Вялікай Айчыннай вайны два ўраджэнцы Беларусі ўзначальвалі войскі франтоў. Гэта камандуючы войскамі Паўночна-Заходняга фронту (чэрвень—ліпень 1941 года), Цэнтральнага фронту (ліпень — жнівень 1941 года) генерал-палкоўнік Фёдар Ісідаравіч Кузняцоў і камандуючы вайскамі Заходняга фронту генерал-палкоўнік, са жніўня 1943-га — генерал арміі Васіль Данілавіч Сакалоўскі (люты 1943-га — красавік 1944 года). У чэрвені 1946 года ён стане Маршалам Савецкага Саюза.

Акрамя таго, тры ўраджэнцы Беларусі былі намеснікамі камандуючага войскамі розных франтоў. Гаворка ідзе пра намесніка камандуючага войскамі Волхаўскага фронту (са жніўня 1943 года), Карэльскага фронту (з лютага 1944 года) Ф. І. Кузняцова, намесніка камандуючага войскамі Сталінградскага (ліпень — верасень 1942 года) і Данскога франтоў (верасень — кастрычнік 1942 года) генерал-маёра Кірылу Аляксеевіча Каваленку (у 1946 годзе ён стане генерал-лейтэнантам), пра намесніка камандуючага войскамі 1-га Беларускага фронту генерала арміі В. Д. Сакалоўскага (красавік — май 1945 года).

Калі біяграфіі Ф. І. Кузняцова і В. Д. Сакалоўскага добра вядомыя, то ў біяграфіі К. А. Каваленкі да сёння шмат белых плям. Дайшло нават да таго, што некаторыя энцыклапедыі, выдадзеныя ў нашай краіне, засакрэцілі яго пасады. Напрыклад, трэці том 18-томнай «Беларускай энцыклапедыі» *(Мінск, 1998. С. 390)* у кароткай біяграфічнай даведцы «Каваленка Кірыла Аляксеевіч» адзначае:

«У Вялікую Айчынную вайну на камандных пасадах на Зах., Сталінградскім, Данскім франтах...»

Гэта ж паўтарае і «Ваенная энцыклапедыя Беларусі» *(Мінск, 2010. С. 458)*.

Малая радзіма Кірылы Аляксеевіча — мястэчка Багушэвічы Ігуменскага павета Мінскай губерні (цяпер — аграгарадок Багушэвічы Бярэзінскага раёна). Тут 31 сакавіка 1891 года ў сялянскай сям'і пачаўся жыццёвы шлях будучага палкаводца.

У 1910 годзе Кірыла Каваленка скончыў настаўніцкую семінарыю ў горадзе Холм Люблінскай губерні, а ў кастрычніку 1919-га — два курсы Мінскага настаўніцкага інстытута.

У час Першай сусветнай вайны Кірыла Каваленка з 1915 года да студзеня 1918 года знаходзіўся ў радах Рускай імператарскай арміі і сустрэў заканчэнне вайны ў раёне Дзвінска ў званні паручніка, начальніка кулямётнай каманды 151-га Пяцігорскага стралковага палка 38-й пяхотнай дывізіі. Ён ваяваў на Заходнім і Паўночна-Заходнім франтах. У студзені 1918 года Кірыла Каваленка быў дэмабілізаваны.

Аб тым, што Кірыла Аляксеевіч ваяваў храбра, сведчаць яго баявыя ўзнагароды — ордэн Святой Ганны 4-й ступені з надпісам «За храбрасць» і Георгіеўскі крыж з лаўровай галінкай.

У пачатку Грамадзянскай вайны Кірыла Каваленка жыў на сваёй малой радзіме — у мястэчку Багушэвічы. Да кастрычніка 1918 года працаваў народным настаўнікам у вёсцы Угалец Пухавіцкай воласці (у Ваенным біяграфічным слоўніку «Великая Отечественная: Комдивы» *(Т. IV. М., 2015. С. 250)* дапушчана памылка. Там гаворыцца, што вёска Угалец была «Пуховецкой волости». — **Э. І.**) Ігуменскага павета Мінскай губерні. З кастрычніка 1919 года Кірыла Каваленка быў сельскім настаўнікам у вёсцы Мурава Белічанскай воласці Ігуменскага павета Мінскай губерні.

У 1920—1921 гадах Кірыла Аляксеевіч у радах Чырвонай Арміі прайшоў многія ступені ваеннай кар'еры: камандзір узвода, роты, батальёна. Так, у маі 1920 года ён быў прызваны ў РСЧА і прызначаны камандзірам узвода 70-га стралковага палка 8-й стралковай дывізіі. У жніўні 1920-га К. Каваленка быў пераведзены ў 47-ы стралковы полк 16-й брыгады 6-й стралковай дывізіі, дзе служыў памочнікам камандзіра і камандзірам узвода, памочнікам камандзіра і камандзірам роты, камандзірам батальёна.

У час польска-савецкай вайны 1920 года Кірыла Аляксеевіч удзельнічаў у наступальных аперацыях пад Беластокам і Гроднам, затым з баямі адступаў да Ліды.

У жніўні 1921 года яго прызначылі памочнікам камандзіра вучэбнага кадравага палка 16-й стралковай брыгады ў складзе Маскоўскай ваеннай акругі, а з 1922 года ён служыў у 6-й Арлоўскай стралковай дывізіі. Потым да 1931 года Кірыла Аляксеевіч у складзе 16-й стралковай дывізіі служыў памочнікам камандзіра 17-га стралковага палка, памочнікам камандзіра і камандзірам 16-га стралковага палка.

Кірыла Каваленка быў адным з высокаадукаваных камандзіраў Чырвонай Арміі, таму што за яго плячыма, акрамя Холмскай настаўніцкай семінарыі і двух курсаў Мінскага настаўніцкага інстытута, было Адэскае пяхотнае вучылішча (1915), Стралкова-тактычныя курсы ўдасканалення камсастава РСЧА імя ІІІ Камінтэрна (1926), двухмесячныя курсы ўдасканалення вышэйшага начальніцкага складу Чырвонай Арміі ў Маскве (1929), Ваенная акадэмія РСЧА імя М. В. Фрунзэ (1934).

У 1931—1939 гадах К. А. Каваленка быў памочнікам інспектара пяхоты Чырвонай Арміі, начальнікам сектара баявой падрыхтоўкі, інспектарам пяхоты, а з лютага 1940 года — старшым інспектарам 1-га аддзела Упраўлення начальніка пяхоты Чырвонай Арміі. У жніўні 1940 года — намеснікам галоўнага інспектара пяхоты Чырвонай Арміі.

У чэрвені 1940 года К. А. Каваленку было прысвоена званне генерал-маёра.

Вялікая Айчынная вайны застала Кірылу Аляксеевіча на службе ў Галоўным упраўленні фарміравання і камплектавання Чырвонай Арміі.

27 чэрвеня 1941 года яго прызначылі камандзірам 242-й стралковай дывізіі 30-й арміі Заходняга фронту. Камандуючым гэтай арміяй з'яўляўся генерал-маёр В. А. Хаменка. З 15 ліпеня 30-я армія ў складзе 119-й, 242-й, 243-й і 251-й стралковых дывізій, 51-й танкавай дывізіі, шэрага артылерыйскіх і іншых часцей была ўключана ў Фронт рэзервных армій і выконвала абарончыя работы ў раёне Смаленска. Потым яна ўдзельнічала ў Смаленскай бітве.

24 ліпеня з раёна Белага (Смаленскі напрамак. — **Э. І.**) група войскаў генерала Хаменкі перайшла ад абароны ў наступленне на войскі вермахта. Праз чатыры дні — 28 ліпеня — у баі каля мястэчка Батурына Батурынскага раёна камдыў 242-й дывізіі К. А. Каваленка быў паранены, але заставаўся ў страі. Яшчэ праз месяц, 28 жніўня, яго зноў цяжка паранілі і ўжо эвакуіравалі ў шпіталь.

У лютым—ліпені 1942 года Кірыла Аляксеевіч праходзіў службу ў Галоўным упраўленні фарміравання і ўкамплектавання Чырвонай Арміі на пасадах намесніка начальніка і выконваючага абавязкі начальніка Упраўлення інспектавання і падрыхтоўкі фарміраваных стралковых часцей і злучэнняў.

27 ліпеня 1942 года Кірыла Аляксеевіч быў прызначаны намеснікам камандуючага войскамі Сталінградскага фронту генерал-палкоўніка А. І. Яроменкі.

З 21 жніўня да пачатку верасня 1942 года К. А. Каваленка ўзначаліў аператыўную групу Сталінградскага фронту (4-ы і 16-ы танкавыя карпусы, 24-я, 84-я і 315-я стралковыя дывізіі). Ён асабіста арганізаваў шэраг контрудараў па часцях 14-га нямецкага танкавага корпуса, які прарваўся да Волгі на поўнач ад Сталінграда.

У сваёй кнізе «Сталінград» камандуючы войскамі Сталінградскага фронту генерал-палкоўнік Андрэй Іванавіч Яроменка адзначаў:

«Ещё 21 августа (1942 года. — **Э. І.**) в районе Самофаловки, Широков, Лозное началось сосредоточение войск, высвобожденных путем перегруппирования, а также прибывающих из резерва Ставки. Образовавшаяся здесь группа в составе 35-й гвардейской стрелковой дивизии и 169-й танковой бригады предназначалась для контрудара по противнику с северо-запада. Командовать группой был назначен заместитель командующего Сталинградским фронтом генерал-майор К. А. Коваленко. Уже во второй половине дня 23 августа эта группа с рубежа Котлубань, Самофаловка контратаковала противника. В упорных боях 35-я гвардейская стрелковая дивизия прорвалась в район Большой Россошки, где мужественно оборонялась 87-я стрелковая дивизия 62-й армии. Гвардейцы овладели Малой Россошкой, Власовкой и высотой 137.2» *(Еременко А. И. Сталинград. М., 2013. С.102)*.

Камандуючы легендарнай 62-й арміяй Сталінградскага фронту Васіль Іванавіч Чуйкоў праз 33 гады пасля тых падзей канстатаваў:

«Для ликвидации прорвавшегося к Волге противника были созданы две ударные группы. Первая — под командованием заместителя командующего Сталинградским фронтом генерал-майора Коваленко К. А., в составе 4-го и 16-го танковых корпусов, 84-й, 24-й, 315-й стрелковых дивизий получила задачу с утра 25 августа нанести удар в направлении балка Сухая Мечетка. Вторая группа в составе 2-го и 23-го танковых корпусов под командованием начальника БТ и МВ Сталинградского фронта генерал-лейтенанта А. Д. Штевнева нацеливалась через Орловку в общем направлении на Ерзовку. Этим двум группам ставилась задача — совместными действиями окружить и уничтожить вражескую группировку, провавшуюся к Волге в районе севернее Сталинграда.

Штаб Сталинградского фронта продолжал оставаться в Сталинграде. Для удобства управления в районе Мал. Ивановки 26 августа был организован ВПУ (вспомогательный пункт управления), на котором находились заместитель командующего фронтом генерал-майор Коваленко К. А. и начальник штаба фронта генерал-майор Никишов Д. Н.

Удары групп генералов Коваленко и Штевнева поставили 14-й танковый корпус противника в тяжелое положение. 26 августа ширина коридора прорыва в районе Котлубань сократилась до 14 километров. Паулюс был вынужден снабжать этот корпус по воздуху» *(Чуйков В. И. Сражение века. М., 1975. С. 79-80)*.

«Из этого не следует, что упорные контратаки группы генерала К. А. Коваленко и усилия армий, действовавших севернее — и на левом берегу Дона, и на задонских плацдармах, были напрасными. Пусть их удары по врагу не всегда могли быть хорошо подготовлены и не всегда давали желанные результаты, но неприятельских сил они сковывали немало. Без этой поддержки 62-й армии пришлось бы еще тяжелее» *(Крылов Н. И. Сталинградский рубеж. Изд. 2-е. М., 1984. С. 46-47, 53)*.

Начальнік Генеральнага штаба, намеснік наркама абароны СССР Маршал Савецкага Саюза А. М. Васілеўскі ў час Сталінградскай бітвы 1942—1943 гадоў з'яўляўся адным з аўтараў і выканаўцаў плана наступальнай аперацыі. Праз 30 гадоў, у 1973-м, ён згадваў у сваіх мемуарах:

«В течение 23 и ночи на 24 августа (1942 года. — **Э. І.**) Самофаловки под управлением нового заместителя командующего Сталинградским фронтом генерал-майора К. А. Коваленко, которого я ранее знал по совместной работе в наркомате, была создана ударная группа из трех стрелковых дивизий, танковой бригады и 28-го танкового корпуса...

Группа войск генерала К. А. Коваленко в ночь на 24 августа (1942 года. — **Э. І.**) разгромила вражеские части, попавшие под ее удар, и к утру вышла к Большим Россошкам, где соединилась с частями 62-й армии...» *(Василевский А. М. Дело всей жизни. М., 1973. С. 212—214)*.

Адначасова з абавязкамі намесніка камандуючага войскамі Сталінградскага фронту генерал-маёр Кірыла Каваленка з 10 да 30 верасня 1942 года выконваў абавязкі начальніка штаба Сталінградскага фронту.

Военный биографический словарь *(Великая Отечественная. Комдивы. Т. IV. М., 2015. С. 251)* сцвярджае, што ў пачатку кастрычніка 1942 года К. А. Каваленка быў прызначаны намеснікам камандуючага войскамі Данскога фронту. На самай справе гэта адбылося 28 верасня 1942 года.

Прывядзём вытрымку з Загада Стаўкі ВГК аб утварэнні Сталінградскага і Данскога франтоў № 994209. Масква. 28 верасня 1942 г.:

«7. Назначить заместителем командующего войсками Донского фронта генерал-майора Коваленко К. А., освободив его от должности начальника штаба Донского фронта...

Ставка Верховного Главнокомандования

И. Сталин

А. Василевский *(Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 132-А. Воп. 2642. Спр. 31. Л. 262-263)*.

Такім чынам, раашэнне Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання ад 28 верасня 1942 года Сталінградскі фронт быў перайменаваны ў Данскі фронт. Кірыла Аляксеевіч заставаўся намеснікам камандуючага войскамі гэтага фронту генерал-лейтэнанта К. К. Ракасоўскага.

Праз два тыдні — 12 кастрычніка 1942 года — генерал-маёр К. А. Каваленка быў адкліканы ў Маскву і прызначаны выконваючым абавязкі галоўнага інспектара — начальніка Упраўлення інспектавання і падрыхтоўкі фарміраваных стралковых часцей і злучэнняў Галоўупраформа Чырвонай Арміі (з 11 лістапада 1943 года — упраўленне інспектавання і баявой падрыхтоўкі запасных і навучальных стралковых часцей).

Кірыла Аляксеевіч з'яўляўся аўтарам і ўдзельнікам распрацоўкі вучэбных дапаможнікаў і настаўленняў для стралковых часцей. У 1942—1943 гадах Каваленка быў членам камісій па распрацоўцы Палявога статута і баявых статутаў (часткі І і ІІ), а таксама Статута ўнутранай службы и Дысцыплінарнага статута.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны Кірыла Аляксеевіч заставаўся на сваёй адказнай пасадзе. Са студзеня 1946 года выконваў абавязкі начальніка Галоўнага ўпраўлення усеагульнага ваеннага навучання, а з мая 1946 года — начальніка Упраўлення усеагульнага ваеннага навучання Галоўнага штаба Сухапутных войскаў.

5 ліпеня 1946 года К. А. Каваленку было прысвоена званне генерал-лейтэнанта.

У лістападзе 1947 года ён быў звольнены ў запас.

Кірыла Аляксеевіч быў узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі, многімі баявымі медалямі.

Яго не стала праз тры дні пасля 35-годдзя Вялікай Перамогі — 12 мая 1980 года, — пайшоў з жыцця на 90-м годзе жыцця.

На вялікі жаль, імя таленавітага савецкага военачальніка і ваеннага дзеяча, баявога паплечніка і намесніка вядомых савецкіх палкаводцаў А. І. Яроменкі і К. К. Ракасоўскага, аднаго з творцаў Вялікай Перамогі Кірылы Аляксеевіча Каваленкі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ніяк не ўвекавечана.

Эмануіл ІОФЕ, прафесар, доктар гістарычных навук.

БРУДНЫЯ БІЗНЕС-ГУЛЬНІ

Хто распаўсюдзіў тытунь па ўсім свеце і чаму ён дагэтуль прыносіць шалёныя прыбыткі?

Згодна са статыстыкай, тытунь штогод забівае больш за 8 мільёнаў чалавек. Мільён з іх — пасіўныя курцы, якія не трымалі ў руках цыгарэты. Нават самая крывавая Другая сусветная вайна не прывяла да такой колькасці ахвяр у год. Ва ўсіх краінах свая методыка барацьбы з курэннем, аднак, нягледзячы на гэта, продажы тытуню не падаюць, а дзесьці нават павялічваюцца. У цяперашні час чысты прыбытак ад тытуню ў свеце складае больш чым 700 мільярдаў долараў. Людзі кураць, нават усведамляючы ўсе негатыўныя наступствы для здароўя.

Хто ж стаіць за распаўсюджваннем тытуню? І як яго ператварылі ў прыбытковы бізнес па ўсім свеце? Якія паводзінскія стэрэатыпы дзесяцігоддзямі ўкаранялі ў нашай свядомасці і чаму яны цалкам памылковыя? Як так атрымалася, што дзякуючы ім, калі мы нервуемся і над чымсьці раздумваем, рука цягнецца да цыгарэт? Чаму нават самыя разбуральныя войны аказаліся для тытунёвага бізнесу часам шалёных прыбыткаў? І чаму ён дагэтуль квітнее, нягледзячы на тое што чалавецтва ведае яго шкоду і ўвяло шэраг забарон? Пра гэта і іншае разважаем разам з нейрахірургам, навуковым супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчыкам кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гуменам ГАРБАНІДЖАДАМ.

— Доктар Гумен, як пачалося распаўсюджванне тытуню?

— За гісторыю яго існавання створана шмат тытунёвых імперый, цывілізацый, мільянераў і мільярдэраў — і нанесены вялікі ўрон чалавецтву. Гісторыя тытуню пачалася 12 тысяч гадоў таму, і, як высветлілі навукоўцы, падчас першага ўжывання тытуню на планеце яшчэ жылі маманты. Яго жавалі, курылі — ёсць розныя методыкі ўжывання.

Тытунь родам з Амерыкі, яго выкарыстоўвалі як лекі, а таксама падчас абрадаў розныя рэлігійныя культы. Калі ў XV стагоддзі еўрапейцы ўвайшлі на амерыканскі кантынент і ўбачылі, што людзі ўжываюць яго ў вялікай колькасці, ім не столькі спадабаўся сам працэс курэння, колькі бізнес, які можна было стварыць з яго дапамогай.

Як вядома, Хрыстафор Калумб у 1492 годзе ўвайшоў у Амерыку, і нейкі час манаполія продажу тытуню як лекаў належала Іспаніі. Вялікабрытанія вырашыла ўнесці дысбаланс у гэты бізнес. Трэба адзначыць, калі мы пачынаем вывучаць многія праблемы, нярэдка ўбачым глыбокі адбітак ног англасаксаў. У 1606 годзе кароль Англіі Джэймс I накіраваў сваіх падданых да берагоў Амерыкі, у цяперашні штат Вірджынія, там з'явіўся першы горад, які адкрылі еўрапейцы на тэрыторыі Амерыкі.

«Шкода ад курэння, нягледзячы на тое, разжоўваецца ён, курыцца ў кальяне, паперы ці трубцы, не змяншаецца. Усё роўна ён вылучае канцэрагены, якія выклікаюць рак, нягледзячы на методыкі курэння. Калі разжоўваць — гэта рызыка раку поласці рота, курыць сігару — у першую чаргу раку ніжняй губы, курыць трубку ці кальян — рак лёгкіх, страўніка і інш.»

Як ні дзіўна, у гэтым месцы тытунь не рос. Але бізнес на той час меў вялікі патэнцыял, і ў 1611 годзе Джон Ролф пачаў з Вірджыніі рухацца на поўдзень Амерыкі, дзе вырошчвалі тытунь. Манаполія на яго належала іспанцам, нават існаваў закон: калі нехта прадасць насенне тытуню не іспанцам, будзе пакараны смерцю. Нягледзячы на гэта, англічанін атрымаў тытунь і прывёз яго на поўнач, дзе і пачаў вырошчваць. Так пачалася вытворчасць і продажы тытуню ў прамысловых аб'ёмах.

Справа пайшла добра. Англічане пачалі яго рэкламаваць як лекі ад любой хваробы, якія здольны выклікаюць эйфарыю. У Вірджыніі тытунь увогуле стаў своеасаблівай валютай. Але з'явілася адна вялікая праблема: попыт вырас, бо англічане ўмелі добра прадаваць. А вытворчасць варта было пашыраць, а для гэтага не хапала рабочай сілы. І ў 1619 годзе англічане пачалі выкарыстоўваць рабскую працу. І да цяперашняга часу англічане на ўвесь свет глядзяць як на патэнцыяльную танную працоўную сілу.

У гэты час пачалі прывозіць рабоў з Афрыкі і Ірландыі. Рабаўладальнік меў права караць іх смерцю, мучыць, калі яны адмаўляліся выконваць загады. З 1641 да 1652 года 500 тысяч ірландцаў загінула, 300 тысяч было прададзена ў рабства. З насельніцтва Ірландыі ў 1,5 мільёна менш чым за 10 гадоў засталося 600 тысяч, астатніх прадалі ў рабства. Адзін з напрамкаў, дзе выкарыстоўвалася іх праца, — тытунёвы бізнес.

Англічане пачалі распаўсюджваць і рэкламаваць тытунь як карысную рэч, якая супакойвае, абязбольвае і лечыць любую хваробу. І з такой рэкламай тытунь хутка распаўсюдзіўся ад Амерыкі да Асманскай імперыі, Ірана і Кітая. На гэтым гандлі разбагацела шмат людзей.

— Калі стала вядома, што цыгарэты — гэта ўсё ж не лекі, а шкодная звычка?

— Упершыню вучоныя заявілі, што нікацін з'яўляецца ядам для арганізма, у 1826 годзе. Але тытунёвыя імперыі па ўсім свеце на чале з Вялікабрытаніяй мелі столькі грошай і ўплыву, што ніхто не мог іх спыніць. Нягледзячы на папярэджванне вучоных, гэты рынак развіваўся.

У той час, акрамя тытуню, развіваліся розныя фабрыкі спадарожных тавараў — па вытворчасці паперы, трубак. Цыгарэты ў паперах былі дарагія, у трубках тытунь курылі простыя людзі. У 1881 годзе амерыканец Джэймс Бонсак стварыў першую машыну па скручванні цыгарэт для прамысловага вырабу, і на рынак выйшла вялікая колькасць танных даступных цыгарэт. Пасля адкрыцця гэтай машыны ўсе пачалі курыць папяровыя цыгарэты ў вялікай колькасці. І гэта дало дадатковы штуршок для таго, каб тытунёвы бізнес развіваўся па ўсім свеце.

— Як з'явіўся кальян? Магчыма, ён менш шкодны, чым цыгарэты?

— У 1500 годзе тытунь дабраўся да Індыі і Ірана. Аднаму з шахаў у Індыі не падабалася трубка, ён загадаў, каб знайшлі іншую методыку, — так стварылі кальян. Паралельна кальян з'явіўся і ў Іране. Але шкода ад курэння, нягледзячы на тое, разжоўваецца ён, курыцца ў кальяне, паперы ці трубцы, не змяншаецца. Усё роўна ён вылучае канцэрагены, якія выклікаюць рак, нягледзячы на методыкі курэння. Калі разжоўваць — гэта рызыка раку поласці рота, курыць сігару — у першую чаргу раку ніжняй губы, курыць трубку ці кальян — рак лёгкіх, страўніка і інш.

— Як войны ўплывалі на тытунёвы бізнес?

— У час Першай і Другой сусветных войнаў бізнес тытуню з вялікім поспехам развіваўся. На ім не толькі разбагацелі пэўныя кланы, сама тытунёвая імперыя вялікімі крокамі пачала рухацца наперад. Усе салдаты, незалежна ад таго кураць яны ці не, атрымлівалі цыгарэты штодзённа. І нават калі яны раней не курылі, ад нечага рабіць паспрабавалі. І гэтыя маладыя мужчыны з вайны вярталіся ўжо заядлымі курцамі, бо цыгарэты выклікаюць моцную залежнасць. Лічыцца, што толькі 4-7 % курцоў могуць без дадатковай дапамогі кінуць курыць.

Трэба сказаць, што тытунёвыя фабрыкі не бясплатна раздавалі цыгарэты салдатам, іх закупляла войска. Пры гэтым вытворцы мелі падвойную выгаду, адразу атрымліваючы столькі залежных. Так што рынак тытуню падчас вайны добра развіваўся.

Як вядома, немцы з даўніх часоў былі добрымі хімікамі і ўжо ў 1930 годзе заявілі пра тое, што тытунь з'яўляецца канцэрагенам і адной з прычын раку лёгкага. Цікава, што нацысты сваім салдатам цыгарэты не давалі і забаранілі курэнне ў закрытых памяшканнях і месцах масавага збору людзей. На той час гэта быў вялікі подзвіг, бо толькі ў 1997-м гэты закон быў прыняты ў ЗША — праз 67 гадоў.

— Прызнанне цыгарэт шкоднымі для здароўя, меры па іх забароне ўплывалі на распаўсюджанне тытуню?

— Гэты бізнес меў вялікі прыбытак і добра развіваўся, нягледзячы на тое што цыгарэты выклікаюць залежнасць. Тытунёвыя магнаты мелі вялікі капітал і ўплыў, каб прыбраць усе перашкоды на сваім шляху. З вялікім скрыпам у 1971 годзе тытунёвая рэклама на тэрыторыі ЗША была забаронена. Нягледзячы на гэта, продаж цыгарэт у такіх гігантаў, як Філіп Морыс і іншых, не ўпаў, бо 80 % курцоў знаходзіцца ў краінах другога і трэцяга свету.

«Тытунь родам з Амерыкі, яго выкарыстоўвалі як лекі, а таксама падчас абрадаў розныя рэлігійныя культы».

Мы ведаем, што краіны, якія развіваюцца, — гэта найперш не тэрыторыі, а людзі, якія маюць пэўнае мысленне і менталітэт. І на іх з дапамогай ментальных войнаў уздзейнічаюць дзесяцігоддзямі. Так, гэта не дае эфект умомант, аднак вынік атрымліваюць праз пакаленне. Але пазбавіцца ад яго дастаткова цяжка. Такім жа чынам з дапамогай розных методык у гэтых краінах укараняюць культуру курэння.

— Цікава, як гэта можна зрабіць?

— Адна з такіх методык — папулярызацыя пэўных паводзінскіх стэрэатыпаў з дапамогай вядомага каўбоя Marlboro Man, яго звалі Эрык Лаўсан. Дарэчы, ён памёр у 2014 годзе ад захворвання лёгкіх. Напрыклад, калі каўбой пасварыўся са сваёй дзяўчынай, ён сядзіць і курыць. Каўбой разважае, як паступіць, — зноў ён сядзіць і курыць. З кімсьці рэзка размаўляе — таксама трымае ў губах цыгарэту. Зноў жа багатыя жанчыны ў брыльянтах і прыгожым адзенні ў розных галівудскіх сцэнах трымалі ў руках цыгарэту. Гэта ўплывала на жанчын.

І дагэтуль стэрэатыпы засталіся: калі нервуешся ці думаеш — пачынаеш курыць. Насамрэч, калі чалавек думае, галаўному мозгу патрэбна больш кіслароду, а цыгарэта затарможвае разумовыя працэсы. Калі чалавек нервуецца, у яго выпрацоўваецца вялікая колькасць гармону стрэсу, і арганізму трэба больш кіслароду, а курэнне замаруджвае гэты працэс. А калі чалавек хоча добра бегаць ці перамагчы ў бойцы, не трэба гэта рабіць з цыгарэтай у губах, бо арганізму патрэбны не яд, а больш кіслароду, каб ён лепш функцыянаваў. Акрамя таго, цыгарэта цалкам блакіруе работу вітамінаў, а ў стрэсавай сітуацыі яны неабходны. Так што гэта падманлівыя стратэгіі паводзін, але іх укаранілі ў масавую культуру. І з пакалення ў пакаленне яны перадаюцца.

— Ці ёсць прыклады паспяховай барацьбы з цыгарэтамі на ўзроўні дзяржаў?

— У цяперашні час цыгарэты — гэта высокатэхналагічны прадукт. Калі цыгарэту разрэзаць і паглядзець знутры, то там не толькі тытунь, а карычневая папера, насычаная хімічнымі рэчывамі. Падчас курэння такіх цыгарэт вылучаецца больш як 70 тысяч розных хімічных злучэнняў, многія з якіх з'яўляюцца моцнымі канцэрагенамі. За кошт таго, што такі псеўдатытунь дадаецца ў цыгарэты, кошт іх вытворчасці істотна змяншаецца, а прыбытак расце. Вытворцы цыгарэт ва ўсіх краінах плацяць дзяржаве вялікія падаткі. І амаль няма ў свеце краін, якія здолелі б адмовіцца ад такога прыбыткова-га бізнесу, нягледзячы на тое што ён нясе ўрон насельніцтву.

Першай краінай у свеце, дзе адмовіліся ад вытворчасці цыгарэт, стаў Бутан. У цяперашні час там цалкам забаронены вырошчванне тытуню, яго вытворчасць і продаж. Цыгарэты прадаюцца толькі ў аптэках за вялікія грошы, і набываць іх могуць тыя, хто курыў да прыняцця гэтага закона. Іншая краіна ў свеце, якая актыўна змагаецца з курэннем, — Туркменістан. Яна плануе да 2025 года стаць зонай, свабоднай ад тытуню.

— Калі чалавек кідае курыць, які этап у гэтым працэсе самы складаны? І ці аднаўляецца арганізм, калі ўдалося пазбавіцца ад шкоднай звычкі?

— Цыгарэты выклікаюць вялікую залежнасць, асабліва сучасныя, у якіх штогод удасканальваецца формула вытворчасці і дадаецца ўсё больш хімічных злучэнняў. Каб не трапіць у залежнасць, лепш увогуле не пачынаць.

Калі чалавек кідае, ёсць станоўчыя змены ў арганізме. Праўда, адразу трэба сказаць, што шкода, якую нанёс тытунь нашай сардэчна-сасудзістай сістэме, незваротная. Але ёсць рэчы, якія мяняюцца ў лепшы бок. Пасля таго як чалавек кідае курыць, у першыя 20 хвілін у арганізме крыху павялічваецца колькасць кіслароду і нармалізуецца ціск, змяншаецца спазм сасудаў. Ён адчувае, што рукі і ногі сталі цяплейшымі (звычайна ў курцоў яны пастаянна мерзнуць). Праз дзве гадзіны з'яўляюцца вяласць, дэпрэсія і пачуццё трывогі, бо не хапае нікаціну і хочацца курыць.

Праз восем гадзін, нягледзячы на тое, што ўзнімаецца ўзровень кіслароду ў эрытрацытах і кроў больш насычаная кіслародам, павялічваецца яе вязкасць і рызыка ўтварэння тромбаў — гэта небяспечны стан. Праз 24 гадзіны ў чалавека пачынаецца моцны кашаль, бо лёгкія ў гэты час пачынаюць пазбаўляцца ад усяго, што назапасілася падчас курэння. Крыху змяншаецца верагоднасць сардэчна-сасудзістых хвароб. Праз 48 гадзін нервовая сістэма прыходзіць у сябе, чалавек пачынае лепш разважаць і думаць. Паляпшаецца адчувальнасць смакавых рэцэптараў на языку. Праўда, у курцоў з вялікім стажам яны могуць ніколі не аднавіцца.

Праз 72 гадзіны наступае максімальная ломка. Чалавек пачынае нервавацца, гэта самы цяжкі час. І калі вы здолелі перасягнуць гэту мяжу, арганізм пачынае адаптавацца. Праз месяц пасля таго, як чалавек кінуў, рэзка змяншаецца рызыка ўтварэння цукровага дыябету 2 тыпу, верагоднасць раку і сардэчна-сасудзістых захворванняў. Праз тры-дзевяць месяцаў у лёгкіх пачынае ўтварацца новы эпітэлій. Пасля года рызыка сардэчна-сасудзістых захворванняў змяншаецца на 50 %.

Пасля 10 гадоў без цыгарэт рызыка анкалогіі лёгкіх змяншаецца толькі на палову ў параўнанні з тымі людзьмі, якія ніколі не курылі. І праз 15 гадоў рызыка інфаркту і сардэчна-сасудзістых захворванняў зраўноўваецца з тымі, хто на працягу жыцця ніколі не курыў. Такім чынам, патрэбна 15 гадоў, каб рызыкі курцоў зраўняліся з тымі, хто ніколі не курыў. Калі за гэты час чалавек зноў вяртаецца да шкоднай звычкі, усе станоўчыя эфекты анулююцца. Так што самая лепшая парада — зусім не пачынаць курыць і растлумачыць гэта сваім дзецям.

Алена КРАВЕЦ.

МЕСЯЦАВЫ ПАСЯЎНЫ

Пры Месяцы, які расце, сокі з кораня паднімаюцца да верхавіны і лісця — рэкамендуецца пасадка і перасадка раслін. Пры Месяцы, які ўбывае, сокі рухаюцца ад верхавіны да кораня — час для пасадкі караняплодаў і абрэзкі раслін. Недапушчальныя дні для пасадак — маладзіковыя дні і дні зацьменняў.

НАЙЛЕПШЫЯ ДНІ ДЛЯ СЯЎБЫ І ПАСАДКІ АГАРОДНІНЫХ КУЛЬТУР

Расліна	Люты	Сакавік	Красавік	Май	Чэрвень	Ліпень	Жнівень	Верасень	Кастрычнік	Лістапад	Снежань
Авёс, жыта, пшаніца, ячмень	2-4, 21, 24-26	1-3, 24-25, 28-30	5, 21-22, 25-26	2-4, 22-24, 30-31	1-2, 19-20, 6-30	23-27, 30-31	19-2, 26-28	16-20, 23-24, 27-28	15-17, 20-21, 24-26	16-18, 21-22, 25-26	18-19, 22-26
Агуркі	2-4, 21	1-3, 28-30	25-26	4, 22-24	1-2, 19-20, 28-30	26-27	22-24	18-20, 27-28	15-17, 24-26	21-22	18-19
Баклажаны	2-4	1-3, 29-30	5	2-4, 30-31	1-2, 26-30	26-27	-	27-28	24-26	21-22	-
Бульба, батат, тапінамбур	9-11, 14-17	9-10, 13-17	9-13	7-10, 17-18	14-15	11-12, 16	7-9, 12-14	4-5, 8-10	1-2, 5-7, 13, 29-30	2-4, 9-11, 29-30	1, 7-8, 11-12, 27-28
Буракі сталовыя	9-13, 16-17	9-13, 15-17, 19-20	7-9, 12-13, 16-17	6, 9-10, 13-15, 17-18	5-7, 9-11, 14-15	4, 7-8, 11-12, 16	3-4, 7-9, 12-14, 31	1, 4-5, 8-10	1-2, 5-7, 13, 29-30	2-4, 9-12, 29-30	1, 7-11, 27-28
Буракі цукровыя	-	-	18-19	15-17	11-13	9-10	5-6	1-3, 30	-	-	-
Гарох, фасоля, сачавіца, боб	1-4, 21, 24-28	1-3, 24-30	5, 21-26	2-4, 20-24, 30-31	1-2, 19-20, 26-30	23-27	19-24	16-20, 27-28	15-17, 24-26	21-22, 25-26	18-19, 22-26
Гарчыца, рапс	2-4, 21-24	1-3, 22-23, 28-30	25-26	4, 22-24	1-3, 19-20, 28-30	1-2, 26-31	22-28	18-24, 27-28	15-21, 24-27	14-18, 21-24	13-15, 18-21
Дайкон	9-13	9-13	7-9, 18-19	6, 15-18	11-15	9-12, 16	5-9, 12-14	1-5, 8-10, 30	1-2, 5-7, 13, 29-30	2-4, 9-12, 29-30	1, 7-11, 27-28
Кабачкі, патысоны	2-4	1-3, 28-30	5, 25-26	2-4, 22-24, 30-31	1-2, 19-20, 26-30	23-27	19-24	16-20	15-17	-	-
Кавуны, дыні, гарбузы	2-4, 21	1-3, 29-30	5, 25-26	2-4, 30-31	1-2, 26-30	26-27	19-23	27-28	24-26	21-22	-
Капуста белакачанная ранняя	2-4, 21, 24-26	1-3, 24-25, 28-30	5, 21-22, 25-26	2-4, 22-24, 30-31	1-2, 19-20, 6-30	23-27, 30-31	19-24, 26-28	16-20, 23-24, 27-28	15-17, 20-21, 24-26	16-18, 21-22, 25-26	18-19, 22-26
Капуста белакачанная сярэдняспелая і позняя, чырвонакачанная, савойская	24-26	24-25	21-22	4	1-2, 28-30	26-27, 30-31	22-24, 26-28	18-20, 23-24	15-17, 20-21	16-18, 25-26	14-15, 22-24
Капуста брокалі, квяцістая	2-4, 21, 24-26	1-3, 24-25, 28-30	5, 21-22, 25-26	2-4, 22-24, 30-31	1-2, 19-20, 26-30	23-27	19-24	16-20, 27-28	15-17, 24-26	21-22, 25-26	18-19, 22-24
Капуста кальрабі, брусельская	12-13	11-13	7-9	4, 6	1-2, 28-30	26-27	22-24	18-20	15-17	-	-
Кроп, пятрушка ліставая, сельдэрэй ліставы, базілік, крэс-салата, кінза	1-4, 27-28	1-3, 6, 26-30	2-4, 22-26, 30	1, 4, 20-24, 27-29	1-3, 19-20, 23-25, 28-30	21-22, 26-27, 30-31	17-19, 22-24, 26-28	15, 18-20, 23-24	15-17, 20-21	16-18	14-15, 24-26
Кукуруза, сланечнік	2-4, 21	1-3, 28-30	5, 25-26	2-4, 22-24, 30-31	1-2, 19-20, 26-30	23-27	19-24	16-20, 27-28	15-17, 24-26	21-22	18-19
Лекавыя расліны («вяршкі»)	2-4	1-3, 28-30	25-26	4, 22-24	1-2, 19-20, 28-30	26-27, 30-31	22-24, 26-28	18-20, 23-24	15-17, 20-21	16-18	14-15
Лекавыя расліны («карэньчыкі»)	12-13, 16-17	11-13, 15-17	7-9, 12-13	6, 9-10	5-7	4, 16	12-14	8-10	5-7	2-4, 12, 29-30	1, 9-11, 27-28
Морква	9-13	9-13, 19-20	7-9, 16-17	6, 13-15, 17-18	9-11, 14-15	7-8, 11-12, 16	3-4, 7-9, 12-14, 31	1, 4-5, 8-10	1-2, 5-7, 13, 29-30	2-4, 9-12, 29-30	1, 7-11, 27-28
Салата, мангольд, шпінат	2-4, 21-26	1-3, 22-25, 28-30	21-22, 25-26	4, 22-24	1-2, 19-20, 28-30	26-27, 30-31	22-24, 26-28	18-20, 23-24, 27-28	15-17, 20-21, 24-27	16-18, 21-26	14-15, 18-24
Памідоры, фізаліс	2-4, 21-24	1-3, 22-23, 28-30	25-26	4, 22-24	1-3, 19-20, 28-30	1-2, 26-29	22-26	18-22, 27-28	15-19, 24-27	14-15, 21-24	13, 18-21
Перац салодкі, горкі	2-4, 21	1-3, 28-30	25-26	4, 22-24	1-3, 19-20, 28-30	1-2, 26-29	22-26	18-22, 27-28	15-19, 24-26	14-15, 21-22	13, 18-19
Пятрушка, сельдэрэй на корань, пастэрнак	9-13, 16-17	9-13, 15-17, 19-20	7-9, 12-13, 16-17	6, 9-10, 13-15, 17-18	5-7, 9-11, 14-17	4, 7-8, 11-16	3-4, 7-14, 31	1, 4-10	1-7, 13, 29-31	1-4, 9-12, 28-30	1, 7-11, 27-28
Пятрушка, каляндра, аніс, кмен на насенне	2-4	1-3, 28-30	25-26	22-24	19-20	-	-	-	-	-	-
Радыска	9-17	9-17, 19-20	7-13, 16-17	6-10, 13-15, 17-18	5-7, 9-11, 14-15	4, 7-8, 11-12	3-4, 7-9, 31	1, 4-5	1-2, 13, 29-30	9-11	7-12
Рэдзька, рэпа, бручка	9-13	9-13	7-9, 18-19	6, 15-18	11-15	9-12, 16	5-9, 12-14	1-5, 8-10, 30	1-2, 5-7, 13, 29-30	2-4, 9-12, 29-30	1, 7-11, 27-28
Травы	21, 24-26	24-25	5, 21-22	2-4, 30-31	1-2, 26-30	23-27	19-24	16-20, 27-28	15-17, 24-26	21-22, 25-26	18-19, 22-24
Фасоля	1-4, 21, 24-28	1-3, 24-30	5, 21-26	2-4, 20-24, 30-31	1-2, 19-20, 26-30	23-27	19-24	16-20, 27-28	15-17, 24-26	21-22, 25-26	18-19, 22-26
Цыбуля на рэпку	12-17	11-17	7-13, 18-19	6-10, 15-17	5-7, 11-13	4, 9-10	5-6	1-3, 30	-	12	9-12
Цыбуля-парэй	1-4, 22-24, 27-28	1-3, 22-23, 26-30	22-26	4, 20-24	1-2, 19-20, 28-30	26-27	22-24	18-20	15-17, 26-27	23-24	20-21, 24-26
Цыбуля-чарнушка на сявок	1, 24-28	24-28	21-24	4, 20-21	1-3, 28-30	1-2, 26-31	22-28	18-24	15-21	14-18, 25-26	13-15, 22-26
Часнок	12-15	11-15	7-11, 18-19	6-8, 15-17	11-13	9-10	5-6	1-3, 30	-	12	9-12

ЗАБАРОНЕНЫЯ ДНІ ДЛЯ СЯЎБЫ, ПАСАДКІ І ПЕРАСАДЖВАННЯ РАСЛІН

Студзень	Люты	Сакавік	Красавік	Май	Чэрвень	Ліпень	Жнівень	Верасень	Кастрычнік	Лістапад	Снежань
6-7, 11-12, 21-23	5, 7-9, 18-20	6-8, 17-19, 21	2-4, 6, 14-15, 20, 30	1, 5, 11-12, 19, 27-29	4, 7-9, 18, 23-25	3, 5-6, 17, 21-22	1-2, 16-19, 28-30, 31	13-15, 25-26, 29	10-12, 14, 22-24, 28-29	7-9, 13, 18-20, 27	4-6, 12-13, 16-17, 26-27, 31

КАЛЯНДАР НА 2023 ГОД

Найлепшыя дні для сяўбы і пасадкі дэкаратыўных дрэў, кустоў і кветак

Расліны або віды работ	Люты	Сакавік	Красавік	Май	Чэрвень	Ліпень	Жнівень	Верасень	Кастрычнік	Лістапад	Снежань
Дэкаратыўныя ліяны, кусты, дрэвы	24-26	6, 24-25	2-4, 21-22, 30	1, 27-29	23-25	21-22, 30-31	17-19, 26-28	15, 23-24	20-21	16-18, 25-26	14-15, 22-24
Кветкі з насення	1, 27-28	26-28	22-24	20-21	3	1-2, 28-29	24-26	20-22	18-19	14-15	13, 24-26
Кветкі цыбульныя, клубневыя, з карэння, у тым ліку пакаёвыя	2-4	1-3, 6, 28-30	2-5, 25-26, 30	1-4, 22-24, 27-31	19-20, 23-28	21-25	17-21	15-17	15	-	-
Пасадка і перасадка хатніх раслін	-	-	-	4	1-2, 28-30	26-27	22-24	18-20	15-17	-	-

Найлепшыя дні для пасадкі пладовых і ягадных культур

Расліна	Люты	Сакавік	Красавік	Май	Чэрвень	Ліпень	Жнівень	Верасень	Кастрычнік	Лістапад	Снежань
Абрыкос, вішня, слива	24-26	24-25	5, 21-22	2-4, 30-31	3, 26-28	1-2, 23-25, 28-31	19-21, 24-28	16-17, 20-24	15, 19-21	14-18, 25-26	13-15, 22-24
Агрэст, ажыны, бружмель, маліны, парэчкі	22-26	6, 22-25	2-4, 21-22, 30	1, 4, 27-29	1-2, 23-25, 28-30	21-22, 26-27	7-19, 22-24	15, 18-20	15-17, 26-27	23-26	20-24
Вінаград	1, 27-28	26-28	22-24	20-21	3	1-2, 28-31	24-28	20-24	18-21	14-18	13-15, 24-26
Груша, яблыня, арэх грэцкі	24-26	24-25	5, 21-22	2-4, 30-31	26-28	23-25, 30-31	19-21, 26-28	16-17, 23-24	15, 20-21	16-18, 25-26	14-15, 22-24
Клубніцы	1-4, 21-24, 27-28	1-3, 22-23, 26-30	22-26	4, 20-24	1-2, 19-20, 28-30	26-27	22-24	18-20, 27-28	15-17, 24-27	21-24	20-21, 24-26
Суніцы рамантантныя	1, 27-28	26-28	22-24	20-21	-	30-31	26-28	23-24	20-21	16-18	14-15, 24-26

Забароненыя дні для пасадкі пладовых дрэў (будзе шмат пустацвета)

Люты	Сакавік	Красавік	Май	Чэрвень	Ліпень	Жнівень	Верасень	Кастрычнік	Лістапад	Снежань
7-9, 18-21	6-8, 17-22	2-4, 14-17, 19-21, 30	1, 11-14, 18-20, 27-29	7-11, 17-19, 23-25	5-8, 16-18, 20-22	1-4, 15-19, 28-31	1, 13-16, 25-28	10-15, 22-26	7-9, 12-14, 18-22	4-6, 11-14, 16-19, 31

ПРАВЯДЗЕННЕ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ РАБОТ

Віды работ	Характарыстыка дзён	Люты	Сакавік	Красавік	Май	Чэрвень	Ліпень	Жнівень	Верасень	Кастрычнік	Лістапад	Снежань
Абганянне, культывацыя, рыхленне	Найлепшыя дні	18-20	17-19, 21	14-15, 20	11-12, 19	7-9, 18	5-6, 17	2, 16, 28-30	14-15, 25-26	14, 22-24	13, 18-20	12-13, 16-17
	Недапушчальныя дні	12-13, 21	11-13, 19-20	7-9, 16-17	4, 6, 13-15	1-2, 9-11, 28-30	7-8, 26-27	3-4, 22-24, 31	1, 18-20, 27-28	15-17, 24-26	12, 21-22	9-11, 18-19
Абразанне дрэў і кустоў	Найлепшыя дні	16-17	15-17, 19-20	16-17	13-15	11	-	-	-	-	12	9-11
	Недапушчальныя дні	5	7	6	5	4	3	1,31	29	28-29	27	26-27
Барацьба з хваробамі	Найлепшыя дні	18-20	17-19, 21	14-15, 20	11-12, 19	7-9, 18	5-6, 17	2, 16, 28-30	14-15, 25-26	14, 22-24	13, 18-20	12-13, 16-17
Водазарадны паліў саду	Найлепшыя дні	5-6, 7, 15-17, 24-25	2-4, 12-13, 21	1-3, 11-13, 19-20, 28-30	7-9, 16-17, 25-26	4, 6, 13-15, 22-24	1-2, 9-11, 19-20, 28-30	7-8, 16, 26-27	3-4, 12-14, 22-24, 31	1, 8-10, 18-20, 27-28	5-7, 15-17, 24-26	2-4, 12, 21-22, 29-30
Высадка, пікіроўка і перасаджванне расады гародніны, якая паспявае над паверхняй зямлі	Найлепшыя дні	2-4	1-3, 28-30	25-26	4, 22-24	1-2, 19-20, 28-30	26-27	22-24	18-20, 27-28	15-17, 24-26	21-22	18-19
Высадка, пікіроўка і перасаджванне расады гародніны, якая паспявае ў зямлі	Найлепшыя дні	12-13	11-13, 19-20	7-9, 16-17	6, 13-15	9-11	7-8, 16	3-4, 12-14, 31	1, 8-10	5-7	2-4, 12, 29-30	1, 9-11, 27-28
Высадка, пікіроўка і перасаджванне расады	Недапушчальныя дні	7-9	6, 8	2-4, 30	1, 27-29	23-25	21-22	17-19	13-14, 15	10-12	7-9	4-6, 31
Высяканне дрэў, выкопванне каранёў (каб не раслі)	Найлепшыя дні	6	-	-	-	-	-	14-16	11-12	8-10	4-6	2-3, 29-31
Збор зеляніны, гародніны, ягад і садавіны для неадкладнага ўжывання	Найлепшыя дні	2-4, 12-13	1-3, 11-13, 29-30	7-9	4, 6	1-2, 9-10, 28-30	7-8, 26-27	3-4, 31	1, 27-28	5-6, 24-26	2-4, 21-22, 29-30	1, 27-28
	Непажаданыя дні	5	7	6	5	4	3	1,31	29	28-29	27	26-27
Збор зеляніны, гародніны, ягад і садавіны для працяглага захоўвання	Найлепшыя дні	14-15	15	18-19	15-17	11-13	10	14-15	11-12	8-10	5-6	11-12
Збор караняплодаў для неадкладнага ўжывання (смачнейшыя, больш сакавітыя)	Найлепшыя дні	21	19-20, 28	16-17, 25-26	13-15, 22-24	11, 19-20	16	12-14, 22-24	8-10, 18-20	6-7, 15-17	12	9-11, 18-19
	Непажаданыя дні	20	21	20	19	18	17	16	14-15	14	13	12-13
Збор караняплодаў для працяглага захоўвання	Найлепшыя дні	14-15	15	18-19	15-17	11-13	10	14-15	11-12	8-10	5-6	11-12
	Недапушчальныя дні	5	7	6	5	4	3	1,31	29	28-29	27	26-27
Збор лекавых раслін — «вяршкі» (увечары да выпадзення расы або раніцай, як раса высахне)	Найлепшыя дні	5	7	6	5	4	3	1,31	29	28-29	27	26-27
Збор лекавых раслін — «карэньчыкі» (увечары да выпадзення расы або раніцай, як раса высахне)	Найлепшыя дні	20	21	20	19	18	17	16	14-15	14	13	12-13
Знішчэнне шкоднікаў	Найлепшыя дні	18-20	17-19, 21	14-15, 20	11-12, 19	7-9, 18	5-6, 17	2, 16, 28-30	14-15, 25-26	14, 22-24	13, 18-20	12-13, 16-17
Касьба травы	Хутка адрастае	1, 27-28	26-28	22-24	20-21	16-17	13-15	9-11	6-7	3-5, 31	1, 28	24-26
	Дрэнна адрастае	5	7	6	5	4	3	1,31	29	28-29	27	26-27
Кансерваванне гародніны і садавіны, квашанне капусты	Найлепшыя дні	21, 24-26	19-20, 24-25	16-17, 21-22	13-15, 17-18	9-11, 14-15	7-8, 11-12	3-4, 7-9, 31	1, 4-5, 27-28	1-2, 24-26, 29-30	21-22, 25-26	18-19, 22-24
	Недапушчальныя дні	20-22	21-23	20-22	19-21	18-20	17-19	16-18	14-17	14-16	13-15	12-15
Капанне бульбы	Найлепшыя дні (лепшыя смакавыя якасці і захоўваемасць)	14-15	15	18-19	15-17	11-13	10	14-15	11-12	8-10	5-6	11-12
	Недапушчальныя дні	12-13	11-13	7-9	4, 6	1-2, 28-30	26-27	22-24	18-20	17	12	9-11
Нарыхтоўка лесу на драўніну і на дровы	Найлепшыя дні	20	21	20	19	18	17	16	14-15	14	13	12-13
	Непажаданыя дні	1-10	2-12	1-11, 30	1-10, 30-31	1-9, 28-30	1-8, 27-31	1-7, 25-31	1-5, 24-30	1-4, 23-31	1-2, 22-30	1-2, 21-31
Нарыхтоўка сокаў (максімум сокаў)	Найлепшыя дні	5-8	7-10	6-9	5-8	4-7	3-6	1-5, 30-31	1-3, 29-30	1-2, 28-31	27-30	26-30
Падкормка арганічнымі ўгнаеннямі	Найлепшыя дні	12-13, 16-17	11-13, 15-17, 19-20	7-9, 12-13, 16-17	6, 9-10, 13-15, 17-18	5-7, 9-11, 14-15	4, 7-8, 11-12, 16	3-4, 7-9, 12-14, 31	1, 4-5, 8-10	1-2, 5-7, 29-30	2-4, 12, 29-30	1, 9-11, 27-28
Падкормка мінеральнымі ўгнаеннямі	Найлепшыя дні	2-4, 21, 24-26	1-3, 24-25, 28-30	21-22, 25-26	4, 22-24	1-2, 19-20, 28-30	26-27, 30-31	22-24, 26-28	18-20, 23-24, 27-28	15-17, 20-21, 24-26	16-18, 21-22, 25-26	14-15, 18-19, 22-24
Прышчэпка	Найлепшыя дні	21	-	-	-	-	-	-	27-28	24-26	21-22	18-19
	Недапушчальныя дні	18-20	17-19, 21	14-15, 20	11-12, 19	7-9, 18	5-6, 17	2, 16, 28-30	14-15, 25-26	14, 22-24	13, 18-20	12-13, 16-17
Укараненне парасткаў, размнажэнне парасткамі	Найлепшыя дні	18-21	17-19, 20-22	14-15, 19-21	11-12, 18-20	7-9, 17-19	5-6, 16-18	2, 15-17, 28-30	13-16, 25-26	13-15, 22-24	12-14, 18-20	11-14, 16-17
	Непажаданыя дні	4-6	6-8	5-7	4-6	3-5	2-4, 30-31	1-3, 29-31	1, 28-30	27-29	26-28	25-28

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5
Продавец	ОАО «Ивацевичдрев», Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46 (**www.ipmtorgi.by**)

Предмет электронных торгов

Четырехкомнатная квартира
(80,4 кв. м, инв. № 122/D-7119,
в состав квартиры входит кладовая в подвале).
Адрес: **Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. В. Клютко, 35-6**

Начальная цена лота (без НДС) – 54 007,77 бел. руб.
(снижена на 35 %)

Задаток **10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ, БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **6 %** от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда от 18.01.2023

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 16.02.2023 с 11.00 до 12.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 15.02.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (www.ipmtorgi.by)

Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06
E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Уша» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества в составе:

Лот № 1: комбайн картофелеуборочный ПКК-2-05 «РТ 25» 2009 года выпуска, заводской номер 46, инвентарный номер 01040166, страна происхождения – Беларусь.
Начальная цена с НДС (20 %) – **38 016,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **3 801,00** бел. руб.

Лот № 2: ботвоуборочная машина БМК-4-75 2010 года выпуска, инвентарный номер 01040266, страна происхождения – Беларусь.
Начальная цена с НДС (20 %) – **4 800,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **480,00** бел. руб.

Лот № 3: гребнеобразователь ГР 4-02 2011 года выпуска, заводской номер 016, инвентарный номер 01040272, страна происхождения – Беларусь.
Начальная цена с НДС (20 %) – **6 528,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **652,00** бел. руб.

Лот № 4: стол переборочный СПР-10, 2011 года выпуска, инвентарный номер 01040279, страна происхождения – Беларусь.
Начальная цена с НДС (20 %) – **7 584,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **758,00** бел. руб.

Начальная цена объектов снижена на 20 %.

Местонахождения:
Минская область, Березинский район, д. Котово.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901 OTHR.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в следующем размере: по лоту № 1 – 5 (пять) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лотам №№ 2–4 – 10 (десять) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 06.12.2022.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: rlt.by, torgi.rlt.by.

Электронные торги состоятся **20.02.2023** в **11.00.**

Заявления с прилагаемыми к ним документами на участие в электронных торгах принимаются не позднее **14.02.2023** до **17.00.**

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.
Тел. для осмотра (8044) 738-17-50.

УНН 600036505

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46, www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов:
Машино-место общей площадью 30,1 кв. м,
инв. номер 500/D-708120446,
расположенное по адресу:
г. Минск, ул. Авакяна, 19-332.
Начальная цена лота с НДС 20 %:
24 360,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи: 10 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов: победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **5** рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в размере 0,6 % от цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Передача предмета аукциона победителю торгов (единственному участнику), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости имущества.
Победителю торгов (единственному участнику) обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины; с государственной регистрацией автомобиля несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 24.12.2022 г.

Дата и время начала и окончания электронных торгов: в 11.00 22.02.2023 до 12.00 22.02.2023.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: по 21.02.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42.
E-mail: auction@cpo.by

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению Лоевского РайПО (продавец) извещает о проведении **14 февраля 2023 года** открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

Лот № 1: Капитальное строение с инв. № 340/С-24859, площадью 392,5 кв. м, (магазин № 8 «Хозтовары», назначение – здание специализированное розничной торговли), расположенное на земельном участке с кадастровым № 323055100001003139 по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, г. п. Лоев, ул. Горького, 19

Стеллажи металлические, инв. № 130 (21 шт.), котел отопительный, инв. № 136, козырек (козырек маг 8), инв. № ЛО0000423

Заключен договор аренды № б/н от 27.03.2019, срок действия до 31.12.2022 г.

Начальная цена продажи без НДС – **112 014,50** бел. руб.
Задаток 10 % – 11 201,45 бел. руб.

Лот № 2: Капитальное строение с инв. № 340/С-25757, площадью 623 кв. м (магазин № 15, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: две пристройки, склад), расположенное на земельном участке с кадастровым № 323055100001000168 по адресу: Гомельская обл., Лоевский р-н, гп. Лоев, ул. Шевелева, 57А

Шкаф холодильный (15), инв. № ЛО677, холодильный шкаф, инв. № ЛО0000368, холодильный шкаф, инв. № ЛО0000396, горки, оборудование «Закуска», инв. № ЛО0000467, котел отопительный закусочная, инв. № ЛО0000457, стеллаж металлический, инв. № ЛО10843 (3 шт.), стеллаж деревянный, инв. № ЛО719 (4 шт.), столы – 5 шт., стулья – 15 шт., светильники – 2 шт.

Заключен договор аренды № 27 от 27.02.2019, срок действия до 30.09.2024 г., договор аренды № 1 от 01.07.2019, срок действия до 01.07.2024 г.

Начальная цена продажи без НДС **– 168 772,50** бел. руб.
Задаток 10 % – 16 877,25 бел. руб.

Продавец: Лоевское районное потребительское общество, Гомельская область, г. п. Лоев, ул. Ленина, 26А. Конт. тел.: +375 44 717-81-55, +375 29 345-09-66. **Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650300226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 13.02.2023 г. в 17.00.

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте **www.deloocenka.by.**

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу согласно договору купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет учтен в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

УНП 193417684

ЗАО «БелБанкротАукцион»,
организатор торгов по продаже имущества
ОАО «Берестовицкая ПМК № 141» (УНП 500020631),
объявляет о проведении **21.02.2023 г.** с 9.00 до 16.00 электронных торгов в форме аукциона.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

ШВАБСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (организатор аукциона) извещает о проведении 14 марта 2023 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	*Адрес земельного участка, кадастровый номер*	*Площадь (га)*	*Ограничения в использовании, инфраструктура*	*Начальная цена (бел. рублей)*	*Размер задатка (бел. рублей)*	*Расходы по изготовлению документации (бел. рублей)*
1.	**д. Мехеды, д. 33, 623287604601000033,** целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,2208	Черта населенного пункта Имеются сети: подъездные пути, водоснабжение	3500,00	700,00	1962,43 + расходы за размещение объявления
2.	**д. Молоди, ул. Тихая, д. 14, 623287605101000387,** целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,1648	Черта населенного пункта Имеются сети: подъездные пути	4000,00	800,00	2353,24 + расходы за размещение объявления

Дата, время и место проведения аукциона 14 марта 2023 г. в 11.00 по адресу: Логойский район, д. Швабы, ул. Парковая, д. 26, Швабский сельский исполнительный комитет, контактные телефоны: **8 (01774) 59 1 35, 59 2 35; (+37529) 1071617.**

Прием документов, ознакомление с участком и документацией: ежедневно с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 (кроме субботы и воскресенья) по 09.03.2023 включительно.

Для участия в аукционе необходимо:

1. подать заявление об участии в аукционе в комиссию по организации и проведении аукционов;

2. представить квитанцию об уплате суммы задатка;

3. представить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;

заключить соглашение с местным исполнительным комитетом.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Задаток перечисляется на р/с № BY21AKBB36006191611010000000, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК банка AKBBBY2X, г. Логойска. УНП 600537220, Швабский сельский исполнительный комитет, код платежа 4901.

Условия: аукцион проводится при наличии двух и более участников. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

Ориентировочная сумма затрат на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры» составляет:

1. д. Мехеды, д. 33 составляет: ориентировочно – 4441,57 бел. руб. (объекты транспортной инфраструктуры – 4223,37, водоснабжение – 218,20);

2. д. Молоди, ул. Тихая, д. 14 составляет: 218,20 бел. руб. (сети водоснабжение ориентировочно – 218,20).

ЯК КОТ НА САЛА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Справа — у першую чаргу — у незаменных тлустых кіслотах. І ў прыватнасці, ва ўнікальным кампаненце — арахідонавай кіслаце (акрамя сала, яна ёсць толькі ў алеі арахісавым і ў невялікіх колькасцях — у аліўкавым). Гэта рэчыва — будаўнічы матэрыял для клетак чалавечага арганізма і ўдзельнік практычна ўсіх біяхімічных працэсаў, якія адбываюцца ў ім. Ужываючы сала, мы ўмацоўваем косці, пазногці і валасы, падтрымліваем рэгенерацыю, знижаем верагоднасць развіцця дэпрэсіі. Паляпшаем работу галаўнога мозга і сардэчнай мышцы, робім больш моцнымі і эластычнымі сценкі сасудаў. А таксама падтрымліваем імунітэт, чысцім бронхі і аднаўляем лёгачную тканку (што асабліва важна і для прафілактыкі коўіду, і пасля перанесенага захворвання). Справа ў тым, што газаабмен паміж паветрам і крывёю ў лёгкіх адбываецца непасрэдна ў альвеолах, ад правільнай работы якіх залежыць, ці будзе наш арганізм адчуваць кіслароднае галаданне. А правільная работа альвеол залежыць ад сурфактанту, якім яны высланы. Дык вось, сурфактант практычна цалкам складаецца з фасфаліпідаў. То-бок яго выпрацоўка залежыць ад паступлення ў арганізм тлушчаў. Такім чынам, у суткі ў нашым клімаце ў халодную пару года варта спажываць каля 30 (ну добра, хай 40) грамаў сала, пішуць дыетолагі. І не менш. Але і не больш! Бо сала — гэта тлушч у чыстым выглядзе: у вялікіх колькасцях яно негатыўна ўплывае на печань, сардэчна-сасудзістую сістэму, а таксама спрыяе набору вагі.

Варанае, вэнджанае сала і іншыя вынаходствы — гэта ўжо не пра карысць, а толькі пра смак. Пры варэнні і вэнджанні карысныя рэчывы губляюцца. Карысней за ўсё для лёгкіх менавіта белае сала, і да таго ж яно найбяспечнейшае. Сала з праслойкамі мяса можа быць небяспечным пры няправільным прыгатаванні або захоўванні, бо менавіта ў мясных пражылках пасяляюцца бактэрыі, здольныя выклікаць атручэнне: у чыстым тлушчы ім няўтульна. Дарэчы, аб славутым халестэрыне. Сёння медыкі сцвярджаюць, што сала якраз нармалізуе ліпідны абмен. Ну і, нарэшце, у сала ёсць супрацьпаказанні: гэта хваробы падстраўнікавай залозы, гепатыт і, цалкам чакана, атлусценне любой ступені.

Што пачым?

Цікава, што ў «коўідных» 2020—2021 гадах чыстае сала без мясных праслоек на Камароўцы каштавала даражэй за сала з мясам. А да гэтага ўсё было інакш: больш смачным і, адпаведна, больш дарагім лічыўся другі варыянт. З прыходам коўіду гэтыя таварныя пазіцыі памяняліся месцамі, а сала многія сталі ўспрымаць не толькі як ежу, але і як лекі: залог здароўя лёгкіх і моцы імунітэту. Цяпер, калі страх перад коўідам крыху зменшыўся, абодва віды сала прыкладна роўныя ў цане.

— У кагосьці даражэйшае белае сала, у кагосьці — з мяснымі пражылкамі. Ва ўсіх па-рознаму, — распавядае абаяльны малады чалавек, які гандлюе хатнім салам.

Ён расказвае, што сала — сапраўды «лагоднае, як масла, растае ў роце!» — прыехала з-пад Навагрудка. Прапануе пакаштаваць і белае, і грудзінку:

— Белае самае карыснае, а з мясам — ужо проста для радасці, для душы. Яно зусім іншае. Але таксама мяккае. Сюды я б параіў крыху часначку — давайце дадам?

— Гэта не «разарэнне», гэта натурпрадукт, — папраўляе ён мяне. — У халадзільніку маеце кавалак сала — і вы ўжо найлепшая гаспадыня. Часам хочацца перакусіць што-нішто, адрэзалі лустачку хлеба, зверху кавалачак сала — прыгажосць!

У халодную пару года асноўную выручку прадаўцы робяць менавіта на сале. На Камароўцы кожную зіму пад сала (а таксама мяснымі разнасолы) адводзіцца практычна ўся правая частка крытага павільёна. Там цяпер можна вывучаць геаграфію Беларусі — сала прапануецца практычна з усіх рэгіёнаў краіны, хоць Мінская вобласць, зразумела, пераважае. У сталіцу сала едзе са Стоўбцаў, Ашмян, Брэста, Навагрудка, Слуцка... Прадстаўлены як фермерскія гаспадаркі, так і дамашняе сала.

— Фермерскае будзе таннейшым. А ў мяне менавіта дамашняе, — распавядае дзяўчына, якая гандлюе салам са Стоўбцаў. — Кожны кавалачак — як масла!

І сапраўды, без высілку пратыкае нажом наскрозь таўшчэзны шмат.

— Хоць таннейшы кавалачак, хоць даражэйшы — усё роўна сала будзе мяккае! — расхвальвае свой тавар.

Сёлета на Камароўцы чамусьці вельмі шмат сала са Стоўбцаў (кожную зіму ў лідары вырываецца нейкі рэгіён, і кожны год ён розны). Здаецца, на радзіме Якуба Коласа ўмеюць зрабіць творам мастацтва што заўгодна: стаўбцоўскае сала настолькі прыгожае — таўсценныя,

беласнежныя кавалкі з глыбокім руковым адлівам, — што пераводзіць цікавасць з разраду гастранамічнай у эстэтычную. Гэтыя шматы хочацца фатаграфаваць. Або нават напісаць з імі нацюрморт.

І ўсё ж прапанова сёлета відавочна перавышае попыт: цэны не проста скаляць зубы — яны кусаюцца, прытым балюча. Чыста белае ці акварэльна-ружаватае, таўшчынёй сантыметраў дзесяць, з тонкай скуркай сала прадаюць у сярэднім за 32 рублі (сустракаюцца варыянты 31,90 і нават 32,90). Сала з мяснымі праслойкамі (грудзінка) абыдзецца танней — можна знайсці нават па 16,90, а вось карэйку прапануюць па 33 рублі за кіло, паляндвіцу — аж за 49! Хоць, вядома, рынак ёсць рынак — заўсёды можна знайсці танней (напрыклад, карэйку па 22) або патаргавацца. Што датычыцца белага сала, самага запатрабаванага, як кажуць прадаўцы, то, калі прабегчыся па радах, у залежнасці ад таўшчыні і мяккасці можна знайсці дамашняе і па 23—26 рублёў за кілаграм, а фермерскае — нават за 20—22.

— Дорага, але людзі купляюць, — паведамілі ў «сальных» радах.

Часам рэшткі прадаюць са зніжкай — па 20 і нават па 17 рублёў за кіло. Цікава, што такая цана была самай высокай — за таўшчэзнае суперсала — тут жа, у гэтых жа радах зімой 2020 года. Тады (крыху раней, у снежні) мы таксама маніторылі цэны на «самы народны» зімовы прадукт. У сярэднім белае сала каштавала тады 15,90 за кіло, а грудзінку можна было купіць па 14. Цэны на сала да 2020-га некалькі гадоў не мяняліся, расказалі прадаўцы, але ў апошнія два гады растуць.

Як выбраць?

Як правільна выбіраць сала, вырашылі ўдакладніць у прафесіяналаў, якія гандлююць гэтым прадуктам з году ў год. Перш за ўсё, сала варта каштаваць, раяць прадаўцы. А для гэтага, зразумела, трэба ісці на рынак. Тым больш у каўбасных аддзелах гіпермаркетаў пры ўсім багацці і разнастайнасці прадуктаў са свініны класічнае белае сала звычайна не прадстаўлена. А на рынку і пакаштаваць адрэжуць, і, па жаданні пакупніка, дададуць прыпраў — кмену, часнаку. Дасведчаныя пакупнікі даўно прыкмецілі сваіх прадаўцоў — пастаянную кліентуру тут шануюць і памятаюць іх густы. І завабліваюць «у свае сеткі» новых кліентаў:

— Прыходзьце па дабаўку...

— Колькі грошай на сала не шкада, столькі і адрэжам...

— Заўсёды падбяром вам самае лепшае...

Ветлівасць і ўвага да жаданняў пакупніка — фірменны камароўскі стыль гандлю спакон веку — цяпер проста зашкальвае: цэны прымушаюць людзей тройчы падумаць, перад тым як купіць.

...Найлепшае, самае смачнае сала, распавялі прадаўцы, павінна пры добрым асвятленні выглядаць снежна-белым і пры гэтым мець глыбокае, лёгкае ружовае адценне. Ляжалае сала, наадварот, «ружавінкі» не мае і нават можа быць жаўтлявым. Такі варыянт — адразу не, раяць яны.

Памер мае значэнне ў пытанні выбару: у ідэале таўшчыня сала павінна быць не меншая за 6 см, хоць і 3 см — дапушчальна. А вось у сала меншай таўшчыні смак будзе ўжо не той. Таксама важна, з якой часткі тушы выразаныя кавалкі: найбольш смачнае сала са спіны і бакоў (менавіта пра такое прадаўцы кажуць: «рэжацца як масла»). Звяртаем увагу на скурку — яна павінна быць чыстай, выскрабанай і без шчаціння. І, зразумела, тоненькай і мяккай — чым танчэй, тым далікатней сала. Прадаўцы з Камароўкі сцвярджаюць (а каму ў гэтым пытанні верыць, калі не ім?), што таўшчыня скуркі ў ідэале не павінна перавышаць 4 мм.

Самым далікатным на смак будзе сала свінкі. Сала кабанчыка больш жорсткае, цалкам магчымы непрыемны прысмак. Для «гендарнага тэста» дастаткова аддзяліць край скуркі непасрэдна ад пласта тлушчу. Калі з дапамогай нажа скурка лёгка аддзяляецца — гэта свінка, а не кабанчык.

Дома гурманы раяць адправіць набытае салёнае сала ў маразілку — гадзіны на дзве. Тады яно будзе рэзацца тонкімі прыгожымі лустачкамі. З чорным хлебам — проста смаката!

Раз салёнае сала дарагое, дык, можа, засаліць яго самастойна? Несалёнае сала больш бюджэтнае за тое, што ўжо гатовае да ўжывання, — 19-20 рублёў за кіло. Сала для засолкі пры набыцці рэкамендуецца панюхаць: яно не павінна пахнуць практычна нічым, любыя староннія пахі — падстава для адмовы ад куплі. Падыдуць для засолкі сала з кумпяка, хрыбта, лапаткі, а вось грудзінка, калі вы не спец у засолцы, хутчэй за ўсё, атрымаецца жарсткаватай.

Недатыкальны запас

Паколькі сала сёння «залатое», пытанне яго правільнага захоўвання актуальнае як ніколі. Захоўваць салёнае сала лепш за ўсё ў халадзільніку. Пры пакаёвай тэмпературы (вышэй +10 °С) прадукт хутка акісляецца, і ўжо праз 5 сутак ужываць яго становіцца небяспечна. У халадзільніку сала захоўваюць, спакаваўшы ў пергаментную паперу або натуральную тканіну — так тэрмін прыдатнасці ўзрастае да 2 месяцаў для чыста белага салёнага сала і да месяца — для сала з праслойкамі мяса. Зверху пергаменту або анучы можна абгарнуць кожны брусок сала (вялікі кавалак лепш разрэзаць на невялікія брускі) харчовай плёнкай — рэзкі пах прыпраў могуць увабрацьіншыя прадукты.

Хочаце захоўваць «энзэ» даўжэй — скарыстайцеся маразілкай. У такім выпадку сала будзе захоўвацца мінімум год. Толькі важна, каб прадукт не размарожваўся і не замарожваўся зноў. Прынцып той жа: загарніце ў паперу для выпечкі або натуральную тканіну, абгарніце кожны кавалак харчовай плёнкай і адпраўляйце ў замарозку. Не забудзьцеся забяспечыць кожны кавалак запіскай з датай куплі і замарозкі — так вы дакладна не будзеце гадаць, колькі сала праляжала ў маразілцы.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, фота аўтара.

Будзь у курсе

«Прад'явіце ваш білецік»

У 2022 годзе да адміністрацыйнай адказнасці за безбілетны праезд прыцягнута больш за 7,4 тысячы грамадзян. За 2022 год кантралёры-рэвізоры Беларускай чыгункі праверылі выкананне правілаў праезду ў 52 тысячах цягнікоў.

Па інфармацыі прэс-цэнтра магістралі, асноўную ўвагу ўдзялялі цягнікам гарадскіх і рэгіянальных ліній эканом-класа, на долю якіх прыпала 96 працэнтаў ад агульнай колькасці праведзеных праверак. Па выніках кантрольных мерапрыемстваў было спагнана штрафу і тарыфу на суму 241,1 тысячы рублёў.

У 2023 годзе Беларуская чыгунка працягне работу па ўзмацненні кантролю аплаты праезду ў цягніках. Беларуская чыгунка заклікае пасажыраў адказна ставіцца да карыстання паслугамі чыгуначнага транспарту і своечасова аплачваць праезд.

Для зручнасці і эканоміі часу пасажыры могуць набыць электронныя праязныя дакументы з дапамогай мабільнага дадатку «БЧ. Мой цягнік», а таксама праз тэрміналы самаабслугоўвання (для цягнікоў з ненумаравanымі месцамі).

Даведачна

Штраф за безбілетны праезд складае:

у цягніках гарадскіх ліній — ад 0,5 да 1 базавай велічыні;

у цягніках рэгіянальных ліній — 0,7 базавай велічыні;

у цягніках міжрэгіянальных і міжнародных ліній — 1 базавую велічыню.

Курэнне (ужыванне) тытунёвых вырабаў, выкарыстанне электронных сістэм курэння, сістэм для ўжывання тытуню ў месцах, дзе яны ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі забароненыя, прыводзяць да накладання штрафу ў памеры да 4 базавых велічынь.

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2022 г. № 967, з 1 студзеня 2023 г. базавая велічыня ўстаноўлена ў памеры 37 рублёў.

У выпадку ўзнікнення спрэчных сітуацый або наяўнасці прапаноў па павышэнні эфектыўнасці кантролю ў цягніках грамадзяне могуць звяртацца па тэлефонах 8-017-225-07-38, 225-39-41.

А не шкодзь!

Вызвалілі са смяротнай пасткі казулю

Але дапамагчы атрымліваецца не ўсім жывёлам

У Браслаўскую міжраённую інспекцыю ад паляўніцтвазнаўца лясгаса паступіла паведамленне аб выяўленні тушы дзікай жывёлы ў пятлі паблізу вёскі Варонка Мёрскага раёна. На месца неадкладна выбыла рэйдавая група інспекцыі і супрацоўнікі РАУС. Падрабязнасці паведамляе Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і раслiннага свету.

Пасля прыбыцця на месца ў пятлі-зашмарзе з металічнага троса была знойдзена дарослая самка высакароднага аленя. Супрацоўнікі Браслаўскай МРІ абследавалі ўчастак мясцовасці, які прылягае да месца выяўлення тушы, і знайшлі яшчэ дзесяць петляў з дроту.

Па слядах, пакінутых на месцы здарэння, работнікам інспекцыі ўдалося ўстанавіць асобу, якая мае дачыненне да ўстаноўкі петляў і незаконнай здабычы паляўнічай жывёлы. Ім аказаўся мясцовы жыхар, які прызнаўся ў здзяйсненні злачынства. Падчас правядзення вобыску па месцы жыхарства ў яго таксама былі знойдзены два мяхі з рыбалоўнымі сеткамі.

Пры аглядзе прыдамовай тэрыторыі супрацоўнікі Браслаўскай МРІ звярнулі ўвагу на сляды, якія вядуць у адрозны ад месца здарэння бок. Рушыўшы па іх, дзяржінспектары знайшлі казулю, якая трапіла ў пятлю. Жывёла рабіла спробы вызваліцца з пасткі, якая ўсё мацней зацягвалася. Работнікі інспекцыі паспелі своечасова і вызвалілі жывёлу. Казуля не пацярпела і была адпушчана на волю. Недалёка знайшлі яшчэ тры пятлі, аналагічныя тым, што ўстанаўліваў падазраваны.

У выніку незаконнай здабычы дарослай самкі высакароднага аленя шкода, прычыненая навакольнаму асяроддзю, склала 900 базавых велічынь. Мёрскім РАСК у дачыненні да мужчыны заведзена крымінальная справа. Браслаўскай МРІ пачаты адміністрацыйныя працэсы за незаконнае паляванне забароненым спосабам і захоўванне забароненых прылад рыбалоўства.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЛЕАНІД ШЧАМЯЛЁЎ: ЧАЛАВЕК, ПАРАНЕНЫ ПРЫГАЖОСЦЮ

Народны мастак Беларусі Леанід Шчамялёў можа быць прыкладам у тым, як ствараць свой лёс. А яго жыццёвы шлях у 97 гадоў — найлепшы доказ таго, што энергія творцы не толькі сілкуе тых, хто глядзіць мастацкія работы, але і выратуе ад удзячных. Сёлета, калі адзначаецца 100-годдзе з дня нараджэння Леаніда Дзмітрыевіча, хочацца згадаць сакрэты яго дзіўнай працавітасці. Такая магчымасць ёсць у галерэі Леаніда Шчамялёва, аснову якой залажыў ён сам, падараваўшы Мінску 60 работ. Але спадчына мастака — гэта і нашчадкі, таму што зерне яго творчай руплівасці прарасло ў дочках і ўнуках. Старэйшай дачцэ Маргарыце пасля смерці таты яго ўдава перадала сціплую кардонную тэчку з лістамі, нататкамі, накідамі, малюнкамі, зробленымі на шматочках паперы яго рукой. Гэта тое, чым тата дапамог ёй знайсці супакаенне пасля страт. Гартае — і ўсміхаецца: вось малюнак акрэсліў вытанчаную постаць каня, шыкоўныя кветкі — як у знакамітых нацюрмортах, накіды, з якіх пазней нараджаліся пейзажы. І фота дачкі розных гадоў, што захоўваў Леанід Дзмітрыевіч, адзначаючы яе поспехі. Маргарыта Леанідаўна працуе з тэкстылем, выкладае ў Акадэміі мастацтваў. І разважае аб прыкладзе таты ў жыцці і мастацтве:

— Тата быў нашай пуцяводнай зоркай, мы нібыта жылі ў цені вялікага дрэва. Для мяне былі важныя сустрэчы з бацькам — у майстэрні, у яго дома. Ён быў вельмі цэльны, вялікі чалавек. Тата быў яркай індывідуальнасцю, таму ён не ўсім падабаўся: ніколі не падладжваўся, не здраджваў сабе.

З дзяцінства ў мяне ў памяці вобраз таты, які ўвесь час у творчым працэсе. У нас была вялікая сям'я, калі мы жылі на Рабкораўскай у маміных бацькоў. Ёсць татава работа таго перыяду, дзе ўвасоблена мама, цяжарная мной, акно, дом — яна вельмі рэалістычная, прытым што вучоба ў інстытуце была яшчэ напярэдзе. Наш дом быў заўсёды адкрыты для людзей, прыходзілі і мастакі, і студэнты, якіх запрашаў тата. Мая бабуля вельмі добра спявала, цудоўна гатавала. Але, нягледзячы на гасцінны дом, часцей за ўсё згадваецца, як тата там малюе. Памятаю: за акном зіма, мы ўсе сядзім у хаце і глядзім, як ён змерзлымі рукамі піша зімовае дрэва. Ён чалавек, які жыў сваёй справай, — быў шчаслівы ў гэтым. Знайшоў сябе адразу пасля вайны.

— Жаданне стаць мастаком у яго было з дзяцінства? Ён прынёс яго праз вайну?

— Як мастачка я мела дачыненне да маляванак — гэта традыцыйны беларускі роспіс. Тата згадаў адзін эпізод з дзяцінства: 1930-я гады, калі быў голад, яны з маці пайшлі на кірмаш прадаваць рэчы. Пакуль ішлі, ён бачыў маляванкі, якія віселі на плоце, а навокал стаяў пах алейнай фарбы — такія першыя сустрэчы з мастацтвам. Яго бацькі віталі занятку творчасцю. Аднойчы яму моцна балела горла, прыйшоў урач і ўбачыў малюнак, у якім тата спрабаваў зрабіць копію карціны, надрукаванай у часопісе. І сказаў: «Беражыце гэтую галоўку, будзе мастаком...»

Тата казаў, што яго заўсёды нібыта вялі за руку нейкія сілы. Неяк на кірмашы ягоная мама купіла паліто, а калі зусім не было грошай, у ім раптам знайшоўся залаты гадзіннік — дапамог не памерці з голаду ў цяжкі час. Лічу, што тата быў напоўнены Богам, хоць гэта і не было відавочна...

— Перажыўшы раненне, відаць, адчуваў руку лёсу?

— Пра раненні распавядаць не любіў, але згадваў, як прыехаў у горад Сямёнаў, пайшоў на кірмаш, і аказалася, што там яго мама і сястра ратаваліся ў эвакуацыі!.. Але пры ўсіх цяжкасцях тата разумеў, што яму патрэбна, і рабіў усё насуперак абставінам. Акрамя службы ў кавалерыі падчас вайны, у таты быў яшчэ адзін абавязак: ён маляваў карты. Адзін генерал убачыў яго здольнасці і даў яму магчымасць рабіць карты для войска. Ужо пасля перамогі яму абяцалі працу, нават выдалі аміуніцыю, коўдру. А калі тата прыехаў у Віцебск да маці (іх хата была знішчана, у горадзе заставалася 168 чалавек, калі не памыляюся), тая пагадзілася: «Трэба табе ў армію...» І раптам тата ўбачыў, што да яго нагі прыляпілася газета з аб'явай пра набор у Мінскае мастацкае вучылішча. Быў маральны выбар: яму даверылі важную працу, а ён гатовы адмовіцца ад вайсковай службы ... Пайшоў і шчыра прызнаўся: «Хачу вучыцца». Яго адпусцілі. Тата заўсёды быў удзячны жыццю за тое, што яму трапляліся добрыя людзі. Ён паступіў у вучылішча, прытым што не меў належнай падрыхтоўкі.

Пасля марай і шчасцем для яго быў інстытут (вучыўся ён як графік). Любімым выкладчыкам быў Віталь Цвірко. І калі Шчамялёў атрымаў майстэрню, у якой дагэтуль працаваў настаўнік і засталіся некаторыя яго рэчы, тата пакінуў іх як напамін. Напрыклад, вялікі вазон з яркімі чырвонымі кветкамі. Аднойчы я прыйшла да таты ў майстэрню, хацела прыбраць ссохлыя лісткі, а ён мяне спыніў: «Нічога не руш! Гэта вазон Цвірко!..» У майстэрні Шчамялёва ні да чога нельга было дакранацца — ні палітру пасунуць, ні пэндзлі яго ўзяць, ні газетку прыбраць: гэта яго прастора, у якую нельга ўмешвацца, яго баявая зброя.

— А ці шмат у яго было сяброў у мастакоўскім асяроддзі?

— Яго сябрам быў скульптар Анатоль Анікейчык, які, на жаль, памёр у 56 гадоў. Таксама сябраваў з Аляксандрам Кішчанкам. Гэта было цікавае сяброўства, яны дапаўнялі адзін аднаго. Кішчанка быў цудоўны апавядальнік, вельмі артыстычны. Памятаю яго з дзяцінства, калі мы жылі ў суседстве ў раёне вуліцы К. Маркса, ён да нас часта заходзіў. Я сядзела ў адным пакоі і прыслухоўвалася, пра што размаўляюць у другім. А там спрэчкі пра мастацтва вялі асобы, якія ўжо сталі легендарнымі, такія як Альгерд Малішэўскі. Разважалі пра нешта вялікае і важнае — магчыма, тады ўпершыню я пачула імёны славутых імпрэсіяністаў.

Насамрэч у таты было шмат сяброў з розных сфер. Напрыклад, Юрый Марухін, кінааператар, які здымаў стужку пра тату. Аднойчы ён нас з сяброўкай вадзіў на здымкі фільма «Магіла льва», дзе іграла легендарная Ніна Ургант. Гэта было, калі тата ўжо з намі не жыў, але ўдзельнічаў у нашым з сястрой жыцці. Мы ніколі не знікалі з поля яго зроку.

Наша маці зрабіла для гэтага ўсё: растлумачыла, што ён з намі не разводзіўся і застаецца нашым татам, працягвае нас любіць. Ён усё жыццё вельмі паважліва ставіўся да нашай мамы, прыходзіў у госці да яе ў сталым узросце, віншаваў з днём нараджэння. Казаў мне: «Твая маці цудоўны, сумленны чалавек». І сапраўды, яна была музыкант, іграла на акардэоне, хадзіла на працу. А ён здолеў сфарміравацца як мастак і асоба ў немалой ступені дзякуючы таму, што яна стварыла для гэтага ўмовы: мог дазволіць сабе не халтурыць, не спакушацца заробкамі грошай, каб выжыць, а займаўся



пошукамі. Мастак Шчамялёў не ўзнік з ніадкуль, як гэта магло падавацца, калі пра яго раптам пачалі пісаць.

— А ў чым выяўляўся яго клопат пра вас?

— Калі я ў бацькоў была яшчэ адна, то ён мяне вельмі апекаваў, асабліва калі дома не было ні мамы, ні бабулі. Мне было гадоў пяць, калі тата аднойчы застаўся са мной. Я хварэла і не хацела есці. Дык ён надзеў мамін халат і нафарбаваў вусны — мне зрабілася вельмі смешна, і ён змог мяне накарміць. Памятаю, як з татавых рук атрымала ў падарунак першы гадзіннік з прыгожым бранзалецікам. Бацькоўская пяшчота выяўлялася і ў тым, як тата мяне маляваў.

Ёсць некалькі маіх партрэтаў, якія ён стварыў у розныя перыяды жыцця. Памятаю, калі была школьніцай, аднойчы сядзела побач, ён працаваў, а на радыё гучаў даклад Хрушчова. Тата заўсёды цікавіўся, што адбываецца навокал. У той жа час мог узняцца над будзённасцю і бытам. Мастацтва для яго было вышэй за ўсё. Бывала, сяджу каля яго, а ён распавядае, як з колерам працаваць... А ёсць у галерэі Шчамялёва цудоўны партрэт, там мая сярэдняя сястра Людачка з кніжкай, дзе напісана «Мастак». Я з удзячнасцю захоўваю партрэт 2005 года, напісаны, калі ў мяне быў складаны перыяд, — у ім святло нібыта ліецца з нябёсаў. Здаецца, тата такім чынам імкнуўся прыцягнуць дабро. Моманты, калі ён пісаў нас, я цяпер разумею як праяву яго любові — як жаданне ўхапіць імгненне і спыніць час, які мы праводзілі разам. Таму што калі ён пісаў, то жыў у прасторы палатна.

— Ці ўплываў на выбар прафесіі дачок?

— Я наогул не выбірала. Здаецца, што нарадзілася з мастацтвам. Пад уплывам маці вучылася ў музычнай школе — фартэпіяна, акардэон. І заўсёды малявала, пайшла ў мастацкую школу. Бацькі мяне не лаялі за двойкі, якія здараліся па дакладных навуках. Тата мог толькі стрымана сказаць: «Віншую...». А быў выпадак, калі я пабілася з хлопчыкам і перастала хадзіць у мастацкую школу — мне было сорамна. Тата даведаўся. Сядзеў хмурны, неяк безнадзейна спытаў, у чым прычына. І я зразумела, што прыйдзецца хадзіць — а пасля захапілася.

Тата нязмушана запальваў нас з Людачкай, якая стала жывапісцам з адметным бачаннем. Наша малодшая сястра Настачка, дачка Святланы Мікалаеўны, хоць і сышла ў іншую галіну, але таксама скончыла мастацкае вучылішча. Мне здаецца, што бацькі заўсёды вучаць сваім прыкладам. Ён ніколі не казаў, ці ганарыцца мной. Але калі ў мяне ў 2003 годзе была выстаўка, ён прыехаў паглядзець, як ствараецца экспазіцыя, а потым быў на адкрыцці. Я зразумела, што яму прыемна. А ў 2013 годзе ён ужо не здолеў наведаць маю выстаўку ў Музеі сучаснага мастацтва, мы ўсё адзнялі, паказалі. І ён сказаў: «Малайчына». Самы дарагі для мяне водгук.

— Якія ўрокі ад яго вы засвоілі?

— Трэба дабівацца таго, чаго хочаш. Гэта значыць, слухаць сябе, верыць у сваю ўласную справу. Ён бачыў свой шлях у творчасці, у гісторыях, у манеры пісаць, незалежна ад таго, хто што думае. Калі я яму казала, што мае работы крытыкуюць, ён пытаўся: «А сама ты як мяркуеш?» Казаў, каб я прыслухоўвалася да ўнутранага голасу. Бо былі людзі, якія выказвалі заўвагі, нават нягледзячы на яго ўзрост. Яму было балюча, але стараўся не паказваць выгляду. Тата як мастак быў розны ў залежнасці ад перыяду творчасці — пачынаў з рэалізму, але стыль яго мяняўся. Гучалі папрокі ў фармалізме, заўвагі, што піша праставата. Гэта ў час панавання сацрэалізму... Цяжкі быў перыяд, у яго тады з'явіліся праблемы з сэрцам. Доўга ляжаў у лякарні, але і там маляваў, бо ўсюды бачыў прыгажосць — і шчасліва выйшаў, пражыў яшчэ 20 гадоў, выяўляючы тое, што захапляла.

Бо што такое татавы работы? Гэта паветра, святло, адчуванне прасторы. Хто б што ні казаў, па сённяшніх мерках для мяне гэта ўсё ж рэальнасць, якую я бачу навокал. Іду па вуліцы — маляўнічы куточак Мінска, нібыта з карціны таты...

Я захаплялася бацькам — тым, што ў яго была свая дакладная лінія жыцця. І выдатная ўнутраная дысцыпліна, магчыма, з часоў службы ў кавалерыі. Штодня тата хадзіў на працу ў майстэрню да 11 гадзін, нават калі мог дазволіць сабе не працаваць. А калі чакаў некага, дасканала прадумваў свой выгляд — паважаў людзей і не цярпеў неахайнасці.

Быў шчаслівы, калі да яго прыходзілі вучні (выкладаў у школе імя Ахрэмчыка), якія ўжо сталі яго калегамі. Адна з вучаніц — Надзя Лівінцава — напісала цудоўны партрэт таты, які захоўваецца ў галерэі Шчамялёва. І Валодзя Крываблоцкі часта бываў у татавым доме. У таты была такая энергетыка, што з ім хацелася і размаўляць, і спрачацца. Ён дзяліўся ўспамінамі, бо ведаў многіх цікавых людзей. Бачыў Якуба Коласа ў жыцці і, я лічу, зрабіў адзін з найлепшых яго партрэтаў. Вельмі любіў беларускую літаратуру, Караткевіча. Паважаў Мулявіна (ёсць эскіз партрэта). Любіў, калі гучала мілагучная беларуская мова. Шчамялёў не заўсёды раскрываў усе свае грані. Быў больш глыбокі, чым магло здавацца.

— Ён належаў да пакалення, якое шмат вытрымала. У чым чэрпаў сілы?

— Асноўнай крыніцай сіл і шчасцем была праца, яна яго трымала на гэтым свеце. І ў яго заўсёды шклянка была напалову поўная. Тата бачыў найперш добрае. У цяжкія перыяды жыцця я тэлефанавала яму, ён жа ўмеў адразу пераключыць увагу на тое, пра што сапраўды варта думаць. Яго прыклад сведчыць аб тым, што жыццё цудоўнае і што мы сюды прыйшлі для таго, каб удасканальвацца. Са мной назаўсёды яго фразы: «Чалавек павінен быць паранены прыгажосцю» і «Мастацтва прыносіць суцяшэнне».

Ад таты я атрымала адчуванне шчасця ад працы. Нібыта з гэтага свету сыходзіш у іншую прастору, якая цалкам належыць табе. Разумею гэта кожны раз, калі бягу з працы дадому, дзе чакае пачаты габелен...

Ларыса ЦІМОШЫК.
Фота з архіва Маргарыты ШЧАМЯЛЁВАЙ.
Больш фота — на zviazda.by.

Максім РАСОХА:

«МУЗЫКА ЯК СМАЧНАЯ СТРАВА»

Максім Расоха стаў мастацкім кіраўніком і галоўным дырыжорам Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі, калі не стала Міхаіла Фінберга. Аркестр цяпер носіць імя Фінберга і не адмаўляецца ад спадчыны, сабранай яго стваральнікам: традыцыйныя фестывалі, канцэрты — іх больш за 60 у год. І новае жыццё — праз новыя праекты, якія Максім Расоха ўмеў прыдумляць, ствараць і напаўняць сэнсам, яшчэ будучы маладым музыкантам. І падумаць толькі: выбіраў паміж кулінарным тэхнікумам і музычным вучылішчам... А творчасць, калі яна ёсць у чалавеку, усё роўна бярэ верх.

— Калі вы зразумелі, што хочаце быць дырыжорам?

— У музычнай школе я вучыўся як трубач, але да музыкі не цягнуўся. Праўда, у адзін момант зразумеў, што ў мяне атрымліваецца, і пачаў праяўляць цікавасць. А калі ў чалавека атрымліваецца, яго хваляць — уключаецца самасвядомасць, жаданне, каб яшчэ пахвалілі. І я вырашыў, што буду граць. Стаяў выбар: альбо кулінарны тэхнікум, альбо музычнае вучылішча. Вельмі люблю кухарыць, не проста па рэцэпце, а ўключаю «чуйку», што можна дадаць да смаку. А музыка — як смачная страва, якую мы выбіраем у рэстаране: калі разумеем, з чаго яна прыгатавана, то ўключаецца ўяўленне ў прадчуванні задавальнення. Я таму на канцэртах і расказваю пра твор, які зараз прагучыць, — у ім ёсць разынка, і я яе раскрываю. Свайго роду музычная кулінарыя. «Смачна» павінна быць і ў музыцы...

Я паступіў у музычнае вучылішча і абраў габой. Разумеў, што мае аднакурснікі ўжо гадоў пяць гралі на інструменце, а я пачынаў з нуля. Даводзілася шмат займацца. А калі быў на другім курсе, мы сабралі невялікі калектыў, для якога я ўпершыню пачаў рабіць аранжыроўкі, дырыжыраваў ім. Затым у акадэміі музыкі, дзе я вучыўся ў класе аркестравага дырыжыравання, мы з сябрамі стварылі квартэт драўляных духавых інструментаў. А пасля па размеркаванні я прыйшоў працаваць у Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь, дзе з'явіўся квартэт «Рыўера». Разам з імі мы сталі ўладальнікамі Гранпры на міжнародным конкурсе ў Фінляндыі, затым было шмат іншых конкурсаў і фестываляў. Таксама запісалі некалькі дыскаў, сярод якіх праграма Яўгена Глебава, куды ўвайшлі балетная сюіта «Маленькі прынц» і музыка да балета «Альпійская балада» ды іншыя творы.

Мяне быццам сам Глебаў падштурхоўваў. Дзякуючы гэтаму кампазітару я трапіў у свет беларускай музыкі: пачуў адзін раз ягоны «Беларускі танец» з «Палескай сюіты» — што за мелодыя!.. Я яшчэ выкладаю ў знакамітай 10-й музычнай школе імя Глебава. Якраз быў юбілей кампазітара, і мы захацелі прадставіць музыку «Дудка-весялушка» з мультфільма — так узнік калектыў з 12 чалавек. І на наступным канцэрце школы ў Доме афіцэраў я ўжо дырыжыраваў ім... З ансамблем «Мінск-Класік» мы запісалі дыск Глебава «Музыка беларускага кіно».

Быў момант, калі паўстала дылема: дырыжыраваць калектывам або граць у ім не дырыжыруючы. І здарылася так, што ў гэты ж час у Прэзідэнцкім аркестры захварэў і галоўны дырыжор, і другі дырыжор, мяне папрасілі выручыць — трэба было запісаць адзін твор. Я прадырыжыраваў. Тады ўсвядоміў, што буду дырыжыраваць. І пазней нават стаў другім дырыжорам гэтага знакамітага аркестра, праўда, гэта ж запасны гулец у спартыўнай камандзе.

Таму, калі мне прапанавалі стаць дэканам аркестравага факультэта акадэміі музыкі, пагадзіўся паспрабаваць. А ўжо праз тры месяцы з духавым аркестрам акадэміі, якім кірую і цяпер, мы паехалі ў Маскву і занялі другое месца на Усерасійскім адкрытым конкурсе духавых аркестраў. Аднойчы да рэктара Кацярыны Мікалаеўны Дулавай я звярнуўся з прапановай аб музычным праекце да 90-годдзя з дня нараджэння Яўгена Глебава. Пасля акадэмія атрымала грант спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, і мы з духавым аркестрам прадставілі гэты праект ва ўсіх абласных гарадах Беларусі. На наступны год я быў адзначаны грантам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сферы культуры.

— Беларуская музыка — гэта ў вялікай ступені загадка для слухачоў?

— Як і ў Міхаіла Якаўлевіча, мой прыярытэт — нацыянальная музыка. У мяне быў перыяд, калі я працяглы час праводзіў у архівах. Шмат музыкі ўдалося знайсці: ноты, рукапісы, вельмі шмат даваенных. Гэтая музыка не гучыць са сцэн, няма яе і ў запісах. Дзякуючы Беларускай акадэміі музыкі былі выпушчаны зборнікі рукапісаў, якія я знайшоў. Цяпер іх можна ўзяць у бібліятэцы і граць творы. Людзі павінны хоць бы раз пачуць музыку, каб зразумець яе каштоўнасць, — а гэта ж наша гісторыя, не кажучы ўжо пра тое, што творы заўсёды нясуць ідэю... У тым лiку творы такіх аўтараў, як Юрый Бяльзацкі. Многія сёння нават не ведаюць такога кампазітара. А ён у 1939 годзе, ратуючыся ад нямецкіх захопнікаў, аказаўся ў Беларусі. Стаў стваральнікам, дырыжорам і кампазітарам Першага дзяржаўнага джаз-аркестра БССР, кіраўніком якога быў заслужаны артыст БССР Эдзі Рознер. У 1947 годзе, калі аркестр быў ліквідаваны, Бяльзацкі мог вярнуцца ў Польшчу, але застаўся тут... Некалькі гадоў таму мы з ансамблем зрабілі перадачу на радыё, выканалі ў пералажэнні музыку Юрыя Бяльзацкага. А да 110-годдзя выйшаў зборнік з яго творамі, музыка стала даступнай для выканання.

На мой погляд, наша задача ў Беларусі — не проста граць музыку, якую ўсе ведаюць і шырока выконваюць. Гэтым публіку не здзівіць. Усё ж нам бліжэй наша, нацыянальная. Яе мы бяром за аснову — усе нашы фестывалі, па сутнасці, дзеля гэтага, кожны раз рыхтуем новую праграму. Напрыклад, на XXII Свята музыкі «Заслаўе-2023», якое адбылося напрыканцы студзеня. Наша праграма складалася з твораў вядомых кампазітараў, якія рэдка выконваюцца, такіх як Генрых Вагнер (яго «Павана» з балета «Пасля балю» гучыць у выкананні струннага аркестра). Чым часцей мы будзем выконваць — нават невялікую п'есу, уверцюру, — тым лепш людзі будуць адчуваць музыку наогул і нашу сучасную беларускую ў прыватнасці.

А ў адным канцэрце тэматычна можна звязаць нават Бетховена і Багатырова! Ёсць шмат паралеляў, праз якія рэальна зацікавіць публіку беларускай музыкай, нават без навязвання 70 працэнтаў па радыё. А чаму складана аказалася знайсці столькі беларускай музыкі? Таму што шмат яе ўтоена ў нашым складаным мінулым і да гэтага часу не знойдзена...

У гісторыі нашай музыкі шмат забытых імёнаў, напрыклад Яўген Грышман, які пісаў эстрадную музыку на аснове беларускага фальклору. А ў 1930-х гадах фальклор у Беларусі быў адным з прыярытэтных кірункаў: колькі экспедыцый арганізавалі Шырма і Цітовіч, а Чуркін сабраў больш за 3000 беларускіх народных песень. Нацыянальнае беларускае мастацтва стала ўзнімацца фактычна сто гадоў таму. І кампазітары пісалі музыку. Для канцэрта ў Заслаўі мы выбралі першы ў музычнай гісторыі нашай краіны фартэпіянны квінтэт на беларускія тэмы Мікалая Аладава, напісаны ў 1925 годзе, ён заснаваны на народных тэмах, на фальклоры, які мы цяпер не ведаем. Калі б у партытуры нейкі выканаўца не падпісаў, дзе якая тэма гучыць, мы б і не даведаліся. Таму не проста выконваць беларускую музыку — яе трэба яшчэ і прадстаўляць зразумелай мовай. Вось чаму я яваду канцэрты акадэмічнай музыкі сам — каб данесці сэнс, які важны для мяне.

— На якіх кампазітараў хочаце звярнуць увагу сёлета?

— Да 70-годдзя Уладзіміра Салтана мы рыхтуем некалькі твораў: зрабілі пералажэнне знакамітага канцэртнага вальса і элегіі — іх тэмы былі ўзятыя з ягонай уласнай музыкі да першага беларускага серыяла «Праклятыя ўтульны дом». Прагучыць знакамітая канцэртная п'еса для саксафона з камерным аркестрам.

У Анатоля Багатырова 110-гадовы юбілей сёлета, мы выконваем вальс Ніны з музыкі да драмы «Маскарад». Глебаў, Смольскі — у нас музыка розных кампазітараў, як вядомых, так і менш вядомых. У прыватнасці, заслужанаму артысту БССР Самуілу Палонскаму ў мінулым годзе споўнілася 120 гадоў. Ён родам з украінскага мястэчка Гайсіна, вучыўся ў Кіеве, але ў канцы 20-х гадоў мінулага стагоддзя прыехаў у Мінск. Атрымалася знайсці рукапіс камернай інструментальнай музыкі — для трубы, для валторны з фартэпіяна, для скрыпкі з фартэпіяна. Фактычна гэта камерная музыка даваеннага перыяду, яе няма ў запісе. У яго ёсць твор «Кірмаш», напісаны для беларускага народнага аркестра. Па сутнасці, гэта музычная ілюстрацыя мінулага Беларусі падобна на «Карцінкі з выстаўкі» Мусаргскага. Сельскае вяселле прыязджае на кірмаш, маладыя выходзяць і сустракаюцца з рознымі персанажамі. Гандляркі паказаны праз беларускую польку. Сляпы іграе на ліры — гучыць «Перапёлачка». Потым яўрэйскія матывы, ідзе «Цыганачка»...

Таксама працуем з музыкай Аляксея Туранкова, кампазітара са складаным лёсам. Яго «Маладаўская дойна», «Іспанскі танец» напісаны больш за 70 гадоў таму. Нашы кампазітары ўвасаблялі ў музыцы тэмы розных народаў, таму можна нават зрабіць асобную праграму «Мелодыі краін свету ў творчасці беларускіх кампазітараў». Думаю, трэба выдаць ноты. Я называю такую працу музычнай археалогіяй: знайшоў рукапіс, прывёў у належны выгляд, інструментаваў, знайшоў магчымасць выканаць і расказаць пра твор.

— У праграму камерных фестываляў Фінберг уключаў сусветную класіку, бо аркестр эстрадна-сімфанічны і павінен «трымаць твар»...

— Мы развіваемся і з акадэмічнай музыкай, калі граем такія творы, як «Брандэнбургскі канцэрт № 3» Баха. Бяром у рэпертуар музыку замежных кампазітараў, такіх як Эдвард Грыг, Дзмітрый Шастаковіч. Рыхтуем канцэрт да 110-годдзя Бенджаміна Брытэна. Прафесійны калектыў павінен выконваць розную музыку, але глыбокую па эмоцыях — яна ўздзейнічае, перш за ўсё, на выканаўцаў, і яны лепш здольныя яе раскрыць. Бо на канцэрце хочацца адчуць не толькі задавальненне, але і пражыць маленькае жыццё — ёсць такая музыка. Напрыклад, «Cantus» кампазітара Арво Пярта, які цяпер жывы, прысвечаны памяці Брытэна. Мы сыгралі на рэпетыцыі, скончылі — а музыканты працягваюць маўкліва сядзець...

— Як вас прынялі музыканты пасля такога аўтарытэтнага кіраўніка, як Фінберг?

— Я чалавек супрацьлеглы Міхаілу Якаўлевічу па характары. З музыкамі кантактую як таварыш. Магу па-сяброўску папрасіць, што трэба зрабіць, не патрабуючы сляпога падпарадкавання. Па-першае, гэта высакакласныя прафесіяналы. Я сам музыкант, а гэта калегі, з якімі я магу рэалізаваць сваё бачанне. З кожным канцэртам яны болей даведваюцца пра мяне, а я — пра іх. Струннай групе больш пашанцавала ў гэтым сэнсе — у нас больш акадэмічных канцэртаў. Часам я яваду канцэрты ў стылі стэнд-ап, як гэта было ў Нясвіжы, дзе ўжо ў новым годзе мы прадставілі праект «Калядны джаз» у радзівілаўскім палацы. «Духавікі» першы раз убачылі, як я яваду канцэрт, — была поўная імправізацыя, у тэатральнай зале акрамя беларусаў былі гледачы з Расіі, Казахстана, Ізраіля, Украіны. А ў ліпені ў дварэ нясвіжскага палаца плануюцца два вечары з праекта «Джаз у горадзе N». Не пабаюся сказаць, што наш аркестр — заканадаўца джазавага мастацтва ў Беларусі. У лютым мы правядзём традыцыйны праект «Мінскі джаз». Натуральна, праз прызму майго разумення гэтай музыкі.

Музыканты, нават тыя, хто доўга працуе ў аркестры, ахвотна ідуць на нешта новае, бо душу не падманеш, а ёй патрэбны свежыя эмоцыі. На шчасце, мы можам іграць музыку розных жанраў і стыляў.

— Канцэртны аркестр народ любіць і ведае ў большай ступені па праграмах папулярнай музыкі...

— І тут наш прыярытэт нязменны — музыка беларускіх аўтараў. Ёсць жаданне выконваць яркую, эфектную. Плануем канцэрт паэта-песенніка Алега Жукава да яго 80-годдзя. У нас папаўненне сярод салістаў: Таццяна Прахарэнка, якая ўдзельнічала ў «Фактар.by», яркая, перспектыўная выканаўца, у ёй бездань драйву і эмоцый, і Андрэй Коласаў, які нядаўна атрымаў медаль Францыска Скарыны.

У сакавіку ў вялікай зале філармоніі прадстаўлю праект «Шлягер на ўсе часы». Першы канцэрт будзе прысвечаны вялікаму Муслiму Магамаеву, юбілей якога адзначаўся летась. Другі канцэрт — бенефіс заслужаных артыстаў Рэспублікі Беларусь, якія працуюць у нас у аркестры, — Наталлі Тамелы і Дзмітрыя Качароўскага. А трэці канцэрт прымеркаваны да 100-годдзя знакамітага савецкага рэжысёра Леаніда Гайдая.

Ёсць думкі развіваць тэму музыкі кіно, тым больш што ў 2024-м — 100-годдзе беларускага кінематографа. Патрэбны або праект, або грант. Таму што аркестр гатовы сыграць любую праграму з любым салістам і ў любым пункце зямнога шара. У чэрвені ў вялікай зале філармоніі струнны аркестр нашага калектыву выступіць з вядучым піяністам Еўропы Цімурам Сергеенем.

Сёлета стартуе праект «Мары дзяцінства». Найлепшыя вучні музычных школ сталіцы будуць іграць пад акампанемент Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі імя М. Я. Фінберга ў канцэртнай зале «Верхні горад». А ў маі найлепшых з найлепшых чакае вялікі канцэрт на вулічнай сцэне каля Ратушы. У нас недаацэньваецца значэнне музычных школ, і мы хочам нагадаць пра іх асноўную функцыю — прывіваць любоў да музычнага мастацтва.

Цяпер у творчым асяроддзі ёсць рынак. З'явілася шмат новых калектываў — гэтаму, як ні дзіўна, паспрыяла пандэмія. Цяпер музыку трэба ўмець прадаць, каб людзі былі гатовы заплаціць грошы за білеты на добры прадукт і найлепшы аркестр.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «МИНСКВОДСТРОЙ»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Форма универсальная для фунд. блоков ФБС 24.4.6, 10 шт.; дополнительные элементы для ФБС 24.3.6	12960,00	1296,00	648,00
2	Бункер БП-1.6, инв. № 460; бункер БП-1.6 СМБ-0.46, инв. № 1062; бадья для бетона БП-1.6, инв. № 254; бункер БН-1,0 Л, инв. № 2417	1080,00	108,00	54,00
3	Подмости, инв. № 1273; подмости шарнирные, инв. № 1444; подмости шарнирные, инв. № 1447; подмости шарнирные, инв. № 1699; подмости шарнирные, инв. № 1445; подмости шарнирные, инв. № 1448; подмости шарнирные, инв. № 970; подмости шарнирные, инв. № 971; подмости инвентарные шарнирно-панельные ПШ-000А (с настилом), инв. № 1247; подмости инвентарные шарнирно-панельные ПШ-000 М2 (с настилом), инв. № 2392; подмости инвентарные шарнирно-панельные ПШ-000 М2 (с настилом), инв. № 2393; подмости инвентарные шарнирно-панельные ПШ-000 М2 (с настилом), инв. № 2394; подмости шарнирные, инв. № 967; подмости, инв. № 1272	7430,40	743,04	371,52
4	Центробежная насосная установка WEL 6-250 в комплекте Varisco, 1 компл., инв. № 2831; шланг соединительный Varisco, 100 шт.; тройник Varisco, 2 шт.; отвод Varisco, 5 шт.; труба Varisco, 13 шт.; иглофильтр длинный (6 м) Varisco, 40 шт.; иглофильтр средний (4 м) Varisco, 30 шт.; иглофильтр короткий (2,5 м) Varisco, 25 шт.	22235,04	2223,50	1111,75
5	Дизель-генератор ДГ-125, инв. № 1389	8856,00	885,60	442,80
6	Пластиковый контейнер на 1000 л. б/у, 3 шт.; емкость пластиковая 1000 л, 1 шт.; емкость пластиковая 1000 л, 2 шт.; емкость пластиковая 1000л, 2 шт.	950,40	95,04	47,52
7	Ящик для пропановых баллонов, 2 шт.; ящик для песка «Каланча» 0,50 м³, 2 шт.	146,88	14,69	7,34
8	Полуавтомат Magster-280 4*4 (B18228-1), инв. № 2395; сварочный агрегат ВД-401, инв. № 728	1198,80	119,88	59,94
9	Трансформатор сварочный TECHNOLOGY 175 HD в кейсе, инв. № 1617; сварочный аппарат MMA-200 LUX ELAND б/у, инв. № 1615; инвертор сварочный HDC Atlanta 200, инв. № 2785	427,68	42,77	21,38
10	Кровать метал., 15 шт.; кровать метал. КМП-1-1.00.000-02, 2 шт.	807,84	80,78	40,39
11	Электронасос «Гном» 6-10 Д 220В, инв. № 2822; насос «Бурун» Н1ВБ2,5/2 380В +Н1В2,5/2 «Бурун Обойма» 2ЗТНП12 000,011, инв. № 2682	486,00	48,60	24,30
12	Холодильник МИНСК-15 /ПТО/, инв. № 19; телевизор «Горизонт»-37\664, инв. № 416; холодильник, инв. № 429; холодильник МХМ 2835, инв. № 703; холодильник-1320, инв. № 894; холодильник МХ М2823-80, инв. № 665; телевизор «Горизонт»-37\664, инв. № 416; телевизор «Горизонт»21А20, инв. № 418; холодильник «Атлант», инв. № 2530; холодильник «МХМ» 2823-80, инв. № 904	414,72	41,47	20,74
13	Компьютер в сборе /ПЭВМ ENERGY. монитор Philips/, инв. № 1685	65,88	6,59	3,29
14	Контейнер для ТБО 02 Б М*-17004/01; контейнер для ТБО 02 Б М*-17004/01; контейнер для ТБО 01К	226,80	22,68	11,34
15	Сейф металлический, 2 шт.; сейф металлический; сейф	262,44	26,24	13,12
16	Стул на раме ISO BLACK 19 С-11, 7 шт.; стул ISO BLACK, 3 шт.	180,36	18,04	9,02
17	Кровать в сборе, 8 шт.; кровать в сборе, 9 шт.; кровать в сборе, 5 шт.; кровать, 1 шт.; кровать, 3 шт.; кровать КРМ1-У б/матраца, РБ, 2 шт.; кровать, 1 шт.	1391,04	139,10	69,55
18	Щит 3000*750*100, 3 шт.; щит 3300*1000*100; щит 2700*740*100; щит 2700*750*100; щит 3000*900*100; щит 3000*800*100; щит 3300*1350*100, 6 шт.; щит 3300*300*100; щит опалубочный ЩК 1350*3300С, 46 шт.; щит опалубочный ЩК 300*3300С, 4 шт.; щит опалубочный ЩК 300*3300Уг, 8 шт.; щит опалубочный Щк 600*3300С, 5 шт.; щит опалубочный ЩК 900*3300Ун, 5 шт.; щит линейный «Гелиос-Армада ST-120» 0,78х3,0, 1 шт.; щит угловой внутренний «Гелиос-Армада ST-120» 0,3х3,0, 4 шт.; щит 3000*200*100; щит линейный «Гелиос-Армада ST-120» 0,3х3,0; подпорный, раскос оцинк., 8 шт.; щит 3000*450*100; щит 3000*600*100, 2 шт.; щит 3000*500*100, 4 шт.; щит угловой внутренний 0,3х0,3х3,0, 4 шт.; щит опалубочный ЩК 1350*3300С, 46 шт.	11747,16	1174,72	587,36
19	Фундамент Ф-1; двухконусный блок 30*30 Н300, 2 шт.; ПДн 10, 6 шт.; ПДн 10	324,22	32,42	16,21
